СА СКАРГАЙ — ДА ДЭПУТАТА

ПЛАНЫ ГОМЕЛЯ НА БУДУЧЫНЮ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

25 КАСТРЫЧНІКА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 204 (29071)

9-24 стар.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый МІКУЛЁНАК, міністр архітэктуры і будаўніцтва:

«У 2019 годзе, паводле інфармацыі з аблвыканкамаў, будуць уведзены ў эксплуатацыю тры дамы з выкарыстаннем электрычнай энергіі: у Баранавічах (Брэсцкая вобласць), аграгарадку Тулава (Віцебская вобласць) і Магілёве. У 2020-м, згодна з даручэннем урада, у цэлым па Беларусі лічба павінна павялічыцца да 150 тысяч м² агульнай плошчы. Усяго налета ў краіне плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 4 мільёны м² жылля, з іх больш за 1,2 мільёна м² для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў і якія ажыццяўляюць будаўніцтва з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі, больш за 1,1 мільёна м² — для шматдзетных сем'яў».

«ПАСЛЯ ПАКРОВА НЯВЕСТА ГАТОВА»

Фота БелТА.

Менавіта гэты восеньскі час у народнай традыцыі лічыцца сезонам вяселляў. Таму выстаўку «Вянок нявесты», якая адкрылася ў Віцебску, можна лічыць вельмі актуальнай. На ёй экспануюцца традыцыйныя галаўныя вясельныя ўборы розных канфесій (прычым не толькі дзявочыя, але і мужчынскія), упрыгожванні дружак і шафераў, старыя фотаздымкі, рэчы з пасагу нявесты, лялечныя тэматычныя кампазіцыі. Усё гэта сабралі і прывезлі супрацоўнікі раённых Дамоў рамёстваў з усяго рэгіёна. Яны ж ахвотна дэманструюць свае экспанаты, як, напрыклад, Ганна ШАЛАЕВА і Марыя МЯЖУЕВА з Гарадоцкага дома рамёстваў і фальклору.

КАРАТКА

- **Намалочана больш за 1 млн тон зерня кукурузы.**
- Больш за 840 школ Беларусі далучыліся да еўрапейскай сеткі школ, якія садзейнічаюць умацаванню здароўя.
- **Пад Гомелем пачаліся выпрабаванні нагрузкай новага моста цераз Сож.**

- У Беларусі за тры дні выяўлена восем аўтамабіляў з падробленымі VIN-кодамі.
- **Мінская міліцыя адзначае рост крадзяжоў з банкаўскіх картаў.**

ISSN 1990 - 763X

Рэпарцёр

Перапісчыка чакалі?

Для тых, хто скарыстаўся інтэрнэтам, перапіс насельніцтва ўжо закончыўся. Пэўная частка людзей схадзіла на перапісныя пункты і там пагутарыла са спецыялістамі. Але ж многія чакаюць, што да іх дадому завітае перапісчык. Мы прайшліся па вуліцах аграгарадка Яроміна, што ў Гомельскім раёне, разам з дзяўчынай мадэльнай знешнасці, перапісчыцай Крысцінай КРАЎЦОВАЙ.

Заплечнік з бутэрбродамі і вадой, фірменная сумка з нататнікам, свістком і ліхтарыкам. Планшэт у руках. Бэйджык-пасведчанне на сіняй стужачцы на шыі. Усё па правілах. Нават абутак: ён зручны, без абцасаў.

СТАР. 3

Тэхналогіі

СЛЕДСТВА ПА НАВУЦЫ

Як малады міліцыянер-вучоны ўдасканальвае якасць экспертнай дзейнасці

Кандыдат юрыдычных навук, падпалкоўнік, выкладчык кафедры аператыўна-вышуковай дзейнасці Магілёўскага інстытута МУС, апантаны сваёй справай вынаходнік — усё гэта пра Ягора Лаппо. Малады чалавек не проста жыве сваёй прафесіяй, ён ёй дыхае. Ягор прызнаецца, што ніколі б сваю работу на іншую не прамяняў. Калегі добра ведаюць: калі Лаппо ўвайшоў у азарт, ён выпадае з часу, забывае і пра сон, і пра ежу. Нават жонка часам раўнуе. Хоць сама таксама міліцыянер. Але менавіта такія і становяцца рухавікамі прагрэсу. Нядаўна вынаходнік запатэнтаваў распрацоўку, якая вельмі аблегчыць работу крыміналістам.

СТАР. 4

У КАЗАХСТАН — З АФІЦЫЙНЫМ ВІЗІТАМ

Учора Аляксандр Лукашэнка асабіста праводзіў у мінскім аэрапорце Прэзідэнта Кубы Мігеля Марыа Дыяса-Канеля Бермудэса і адправіўся з афіцыйным візітам у Казахстан. У Нур-Султане яго каля самага трапа сустракаў кіраўнік краіны — Касым-Жамарт Такаеў. Такія дзеянні лідараў — знакі асаблівай пашаны і сяброўскіх адносін паміж імі.

Пасля прылёту Аляксандр Лукашэнка ўсклаў кветкі да манумента «Абаронцы Айчыны», дзе звычайна адбываюцца ўрачыстасці да Дня Перамогі. Учора вечарам лідары краін абмеркавалі ўзаемадзеянне падчас нефармальнай вячэры. Сёння пачнуцца афіцыйныя перамовы. Плануецца, што асаблівы акцэнт на сустрэчы зробяць на гандлёва-эканамічным партнёрстве, пашырэнні прамысловай кааперацыі, узаемадзеянні ў сферы транспарту і высокіх тэхналогій. Чакаецца таксама заключэнне пагаднення аб пастаўцы і перапрацоўцы ў Беларусі казахстанскай нафты.

Учора ў Нур-Султане адбыўся беларуска-казахстанскі бізнес-форум, прымеркаваны да афіцыйнага візіту. Як расказаў журналістам БелТА старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір Улаховіч, там заключаны кантракты на 75 мільёнаў доларaў ЗША.

У прыватнасці, БелАЗ падпісаў пагадненне аб сумеснай вытворчасці прадукцыі з прадпрыемствам «Астана-БелазСэрвіс К», «Гомсельмаш» і «Аграмашхолдынг KZ» заключылі пагадненне аб рэалізацыі прадукцыі, холдынг «Бабруйскаграмаш» дамовіўся аб пастаўках з кампаніямі «АграБізнесКазахстан» і «Аксуат». Мінскі трактарны завод падпісаў чатыры пагадненні аб сумеснай вытворчасці прадукцыі — з таварыствамі «Казахстанская Агра Інавацыйная карпарацыя», «Гандлёвы дом Беларускі трактар», «СемАЗ» і «Кампазіт Груп Казахстан». Аналагічны дакумент заключыў Мінскі аўтамабільны завод з HyundaiTransAuto.

ВЫКЛЮЧНА РАЗУМНЫЯ СТАЎКІ

Але пад заклад патрыманага смартфона грошай ужо не дадуць

У нашай краіне ўводзяцца змены ў рынку мікрапазык. Доўгачаканы дакумент, які павысіць даступнасць фінансавання для насельніцтва, накіраваны на абарону правоў спажыўцоў паслуг мікрафінансавых арганізацый. Пра гэта расказалі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка, каментуючы падпісаны кіраўніком дзяржавы Указ № 394 «Аб прадастаўленні і прыцягненні пазык».

Нагадаем, што цяпер мікрафінансавыя арганізацыі не абмежаваныя ў памеры працэнтаў, а таксама штрафаў і пеняў, якія яны выстаўляюць сваім кліентам, якія дапускаюць пратэрміноўку ў пагашэнні пазыкі.

Прэзідэнцкі ўказ павінен урэгуляваць гэтае пытанне. У прэс-службе Нацбанка адзначылі, што новаўвядзенні мяркуюць далейшае зніжэнне пазыковай нагрузкі на кліентаў праз абмежаванні сумы працэнтаў і няўстойкі, якія налічваюцца па дагаворах мікрапазыкі. Максімальны памер працэнтаў за ўвесь перыяд карыстання грашовымі сродкамі **не можа перавышаць двухразовы памер асноўнага доўгу, а няўстойка (штраф, пеня) за парушэнне ўмоў — палову памеру асноўнага доўгу.** «Абмежаванне закране ўсе дагаворы мікрапазыкі, у тым ліку заключаныя да моманту ўступлення ў сілу Указа № 394», — растлумачылі ў Нацбанку.

Пры гэтым фінансавыя ўлады краіны забаранілі выдачу мікрапазык некамерцыйнымі арганізацыямі, якія створаныя ў форме фондаў.

Каб выключыць асобныя нядобрасумленныя практыкі, абмяжоўваецца спектр рэчаў, якія выступаюць прадметам лізінгу па дагаворах. Імі змогуць стаць толькі транспартныя сродкі і жылыя памяшканні. Аналіз паказаў, што пад выглядам дагавораў зваротнага лізінгу тэлефонаў, смартфонаў і іншай бытавой тэхнікі фактычна даваліся грошы ў пазыку пад завышаныя працэнтныя стаўкі без належнага інфармавання спажыўцоў.

Акрамя таго замацаваныя правы спажыўцоў паслуг, у тым ліку ў частцы атрымання поўнай і дакладнай інфармацыі аб умовах дагавора мікрапазыкі, правільнага разліку працэнтаў. Ва ўказе прапісаныя паўнамоцтвы Нацбанка па кірунку прадпісанняў мікрафінансавым арганізацыям у выпадках парушэння імі заканадаўства. Устаноўлены патрабаванні да рэкламнай дзейнасці па выдачы пазык, а таксама да інфармацыі, якая размяшчаецца на сайтах мікрафінансавых арганізацый.

Асноўныя палажэнні згаданага ўказа ўступаюць у сілу праз шэсць месяцаў пасля афіцыйнага апублікавання. Гэты час даецца Нацыянальнаму банку і Савету Міністраў, каб прывесці нарматыўныя прававыя акты ў адпаведнасць.

Сяргей КУРКАЧ.

Выбары-2019

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ: ЖАНЧЫНЫ І МОЛАДЗЬ?

Сярод галоўных прычын адмовы ў рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты — недакладнасць дэкларацый і несапраўдныя подпісы.

Акруговыя выбарчыя камісіі зарэгістравалі 560 кандыдатаў у дэпутаты з 703 прэтэндэнтаў. Аб гэтым паведаміла **старшыня Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА** ў відэаінтэрв'ю на сайце Нацыянальнага прэс-цэнтра.

Кіраўнік Цэнтрвыбаркама адзначыла, што частцы патэнцыйных кандыдатаў — 22 ахвотным — бясспрэчна адмоўлена ў рэгістрацыі. У гэтых прэтэндэнтаў не было права звярнуцца з заявамі, паколькі іх вылучылі грамадскія аб'яднанні, якім закон не надае правоў вылучэння кандыдатаў у дэпутаты.

«У сухім астатку больш за ўсё засталося кандыдатаў ад палітычных партый — больш за чатырыста. Астатнія — кандыдаты, вылучаныя шляхам збору подпісаў, і ад працоўных калектываў», — звярнула ўвагу Лідзія Ярмошына. Па яе словах прэтэндэнты ад палітычных партый адмоў атрымалі няшмат. Як правіла, яны звязаныя з недакладнасцю дэкларацый аб даходах і маёмасці.

У грамадзян, якія вылучаліся шляхам збору подпісаў, высокі працэнт несапраўдных подпісаў. Часцей гэта не адмысловая фальсіфікацыя, а памылкі ў падпісных лістах праз няведанне закона, падкрэсліла кіраўнік ЦВК.

«Некаторыя кандыдаты па патрабаваннях, якія прад'яўляе закон, проста не могуць выбірацца ў дэпутаты. Напрыклад, каб стаць дэпутатам парламента, трэба пастаянна пражываць на тэрыторыі Беларусі», — адзначыла Лідзія Ярмошына.

Шэраг абласных выбарчых камісій ужо разгледзелі скаргі. У выпадку незадаволенасці прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат іх шлях ляжыць у абласны ці Мінскі гарадскі суд, рашэнні якіх — канчатковыя.

Па інфармацыі кіраўніка Цэнтрвыбаркама, больш за ўсё кандыдатаў у дэпутаты працуюць у сферы прамысловасці і транспарту, на другім месцы — прадстаўнікі галіны культуры і адукацыі, трэцяе — у работнікаў дзяржструктур. Удзельнічаюць у выбарах пенсіянеры, якія не прапускалі і папярэднія кампаніі.

У параўнанні з кампаніяй 2016 года сярод зарэгістраваных кандыдатаў павялічылася колькасць жанчын, моладзі да 30 гадоў.

Варвара МАРОЗАВА.

Супрацоўніцтва

Прыклад канструктыўнага дыялогу

Так называе беларуска-турэцкія адносіны Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Турцыі ў Беларусі Кезбан Нілвана ДАРАМА. Падчас сустрэчы ў Нацыянальным прэс-цэнтры з нагоды Дня Рэспублікі Турцыі і заканчэння яе дыпламатычнай місіі яна расказала, што вельмі хацела заваяваць сэрцы беларусаў. Але адбылося наадварот. «Беларускі народ завяваў маё сэрца», — прызналася пасол.

Кезбан Нілвана Дарама падвяла вынікі сваёй работы за чатыры гады, расказала пра дынаміку двухбаковых адносін у сферы інвестыцый, бізнесу, турызму.

Аснову гандлёвага партнёрства краін складаюць кантакты бізнесколаў. У тым ліку, дзякуючы ім, узаемны тавараабарот расце з году ў год і ў 2018-м склаў адзін мільярд доларaў ЗША. Новая мэта, якую паставілі лідары дзяржаў, — лічба ў 1,5 мільярда. На думку пасла, дасягнуць яе магчыма ў тэрмін ад двух да пяці гадоў.

Пры гэтым журналісты пацікавіліся, як ураўнаважыць двухбаковы гандаль і пазбавіцца значнай перавагі Турцыі ў сальда. «Пакуль вядзецца работа над трэцімі таварнымі групамі, трэба ўлічваць і лагістыку паставак, паколькі дастаўка тавару таксама можа значна адбівацца на яго цане», — паведаміла Кезбан Нілвана Дарама. Займаецца збалансаваннем гандлю і рабочая група, створаная пры міжурадавай камісіі.

Перспектыву турэцкія партнёры для беларускага бізнесу бачаць у зоне свабоднага гандлю краіны з ЕС і выгадным размяшчэнні паблізу з азіяцкім і афрыканскім рэгіёнамі. Наша дзяржава ў сваю чаргу — зручны партнёр для выхаду на рынак ЕАЭС.

Вялікі патэнцыял маюць інвестыцыі. У Беларусі ўжо працуюць 139 кампаній з турэцкім капіталам, самы маштабны праект з 1,3 мільярда доларaў ЗША інвестыцый — у сферу тэлекамунікацый. Але цікавяць партнёраў і лагістыка, сельская гаспадарка, здабыча мінеральных угнаенняў, касметыка, будаўнічыя матэрыялы, рабочыя машыны і механізмы, аўтакамплектуючыя.

Беларускі бізнес таксама бачыць перспектывы на турэцкім беразе. У горадзе Кырыкале разам з азербайджанскімі калегамі працуе вытворчасць па зборцы трактароў. Разглядаюцца магчымасці па арганізацыі вытворчасці спецыяльнай, будаўнічай, дарожна-ўборачнай тэхнікі. Кампанія цацак «Палессе» будуе сваю фабрыку ў Турцыі. Гэта дасць магчымасць пастаўляць цацкі і ў суседнія краіны. Пашырыць спектр магчымых праектаў дапаможа і другі інвестыцыйны форум у 2020 годзе.

І канешне, Турцыя — адзін з самых улюбёных курортаў. У 2018 годзе з прыростам сем працэнтаў краіну наведалі 245 тысяч турыстаў з Беларусі. Адчуваючы гэтую тэндэнцыю, расце і колькасць авіярэйсаў па маршруце Мінск—Стамбул, з вясны іх будзе ўжо 14 у тыдзень.

Марыя ДАДАЛКА.

ВАЖНЫЯ ЗВАНКІ

Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 26 кастрычніка ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. З 9.00 да 12.00 у суботу іх правядуць:

кіраўнік справы БРЭСЦКАГА аблвыканкама Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Іспаніі эксгумавалі астанкі Франсіска Франка

Спецыялісты эксгумавалі ў чацвер астанкі іспанскага дыктатара Франсіска Франка (1892—1975), якія былі пахаваны ў манументальным комплексе «Даліна палеглых» каля Мадрыда. Пра гэта паведамілі ва ўрадзе краіны.

Каб дастаць труну, у якой 44 гады таму быў пахаваны Франка, паднялі гранітную пліту вагой у 1,5 тоны, што пакрывала магілу.

Улады Іспаніі забаранілі выкарыстанне мабільных тэлефонаў у ходзе працэдуры. Акрамя таго, усе прысутныя павінны былі прайсці праз металашукальнік. Прадстаўнікоў СМІ на эксгумацыю не пусцілі. Як чакаецца, у хуткім часе рэшткі дыктатара на верталёце будуць дастаўлены на могілкі ў Эль-Парда-Мінгарубія. Там адбудзецца перапахаванне каўдыльё, перад пахаваннем пройдзе служба. На цырымоніі дазволілі прысутнічаць 22 сваякам Франка. Новае месца пахавання дыктатара будзе знаходзіцца ў склепе, дзе ў 1988 годзе была пахавана яго жонка Кармэн Пола.

Эксгумацыя Франка стала адной з першых ініцыятыў, агучаных сацыялістычным урадам практычна адразу пасля прыходу да ўлады летам 2018 года. Для гэтага кабмін адобрыў дэкрэт, які меў на ўвазе ўнясенне пэўных змяненняў у закон аб гістарычнай памяці.

Знойдзеныя ў прычэпе грузавіка ў Англіі 39 загінулых былі грамадзянамі Кітая

Усе 39 чалавек, целы якіх былі ў сераду знойдзены ў прычэпе грузавіка ў Эсэксе, паводле меркаванняў брытанскай паліцыі, былі грамадзянамі Кітая. Пра гэта гаворыцца ў паведамленні, распаўсюджаным прэс-службай паліцэйскага ўпраўлення графства Эсэкс. «Было ўстаноўлена, што сярод загінулых восем жанчын. Ёсць падставы меркаваць, што ўсе яны з'яўляюцца грамадзянамі Кітая. Па падазрэнні ў забойстве затрыманы адзін чалавек, які працягвае заставацца пад вартай», — сказана ў паведамленні. У паліцыі таксама ўдакладнілі, што ўсе, хто загінуў, — дарослыя, тады як раней паведамлялася, што сярод іх быў адзін падлетак.

За апошнія суткі паліцыя правяла вобыскі па трох адрасах у паўночнаірландскім графстве Арма, на тэрыторыі якога, па звестках вяшчальнай карпарацыі «Бі-бі-сі», пражывае адзіны падазраваны, 25-гадовы жыхар Паўночнай Ірландыі. Паліцыя вывучае магчымую датычнасць маладога чалавека да дзейнасці груповак, якія спецыялізуюцца на перавозцы нелегальных мігрантаў у Еўропу.

Зараз асобы загінулых і абставіны іх смерці высвятляюцца. У якасці папярэдняй прычыны брытанскія СМІ называюць пераахаладжэнне. Тэмпература ўнутры фуры-рэфрыжэратара, у якой былі знойдзены целы, знаходзілася на адзнацы мінус 25 градусаў па Цэльсію.

Пяскоў: Пуцін кіруецца Канстытуцыяй

У пытанні тэрміну знаходжання на вышэйшай дзяржаўнай пасадзе прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін кіруецца Канстытуцыяй Расіі, а не ўзростам. Пра гэта заявіў журналістам прэс-сакратар расійскага лідара Дзмітрый Пяскоў, адказваючы на пытанне, які ўзрост Пуцін лічыць для сябе гранічным для работы на пасадзе кіраўніка дзяржавы. «Работа прэзідэнта рэгламентуецца Канстытуцыяй РФ, — нагадаў афіцыйны прадстаўнік Крамля. — Бачанне ў яго (Пуціна. — **«Зв.»**) заключаецца ў прытрымліванні Канстытуцыі».

Канстытуцыя РФ не ўстанаўлівае гранічнага ўзросту знаходжання прэзідэнта на пасадзе. Асноўны закон забараняе толькі займаць гэтую пасаду асобам, маладзейшым за 35 гадоў. Таксама ён абмяжоўвае знаходжанне на пасадзе прэзідэнта Расіі больш чым двума тэрмінамі запар.

Перапісчыка чакалі?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Надвор'е абяцае прыемную прагулку па вясковых вуліцах з рамантычнымі назвамі: Кляновая, Азёрная, Светлая... Крысціне дастаўся ўчастак, дзе ёсць пяціпавярховікі, але ж і прыватных дамоў хапае. Туды і крочым.

Першы дом за высокай бетоннай агароджай. Нясмелы стук у дзверы. Потым яшчэ і яшчэ раз. Стаім некалькі хвілін і прыслухоўваемся, ці ёсць хоць бы нейкі водгук. Дарэмна. Ідзём да дома насупраць. І тут нас не чуюць, не чакаюць. Такім чынам, прабягаем усю вуліцу. Безвынікова. На гадзінніку — 17.00, і мы робім высновы, што яшчэ ўсе на рабоце.

— О, дзесьці чутна мелодыя, — радуецца Крысціна, і мы хуценька накіроўваемся на гук.

Высвятляецца, рабочыя-будаўнікі аднаго з будучых дамоў, каб працаваць весялей, уключылі музыку. Гаспадароў няма. Значыць, і тут мы дарэмна. Ужо на вуліцы Светлай ля будоўлі сустракаем двух мужчын у рабочым адзенні, старэйшага і маладзейшага. Відаць, бацька з сынам. Яны кажуць, што дом іх тут толькі будуецца, ніхто ў ім пакуль не зарэгістраваны, а перапіс пройдуць па месцы жыхарства.

Частка сядзіб, каля якіх мы праходзім, яшчэ да канца не ўладкаваны. Дзесці бачны ўжо газоны і альпійскія горкі, а дзесьці рэшткі будматэрыялаў і смецце. І паўсюдна вялізныя сабакі.

Пад сабачы хор амаль у адчаі мы падыходзім да наступнага дома, дзе адчынены вароты. Сталы мужчына з сякерай глядзіць на бэйджык, планшэт, сумку з лагатыпам і адпраўляе нас да жонкі. Рукой паказвае напрамак:

— Яна вам усё раскажа!

Сціпла чакаем, пакуль жанчына вылезе са склепа. Яна вітаецца, але калі бачыць камеру, катэгарычна адмаўляецца фатаграфавацца. Яе права. Крысціна задае пытанні па вызначаным спісе, адказы на якія не выклікаюць праблем. На пытанне — плошча дома — гаспадыня адказвае:

— Дом 130 квадратаў, але напішыце 100.

На пытанне «Ці плануеце вы з'ехаць з Беларусі» — выразны погляд і ўсмешка: а як вы думаеце? Размова заходзіць пра родную мову. Жанчына, якая родам з Чачэрскага раёна, адказвае:

— Мясцовая.

Крысціна ў планшэце знаходзіць: «Іншая» і далей па спісе выбірае «беларуска-руская». Жанчына з такім варыянтам згаджаецца. Тое ж пытанне датычыцца і яе сужэнца. У гэтым выпадку пенсіянерка дадае:

— Пішыце беларуска-руская і тая, на якой ён лаецца.

— Такога ў нас няма, — бянтэжыцца юная дзяўчына.

— Трэба і гэта прапісаць, — адказвае гаспадыня і нечакана ўспамінае, што ёй самой у далёкім 1989 годзе прыйшлося папрацаваць перапісчыцай: «Цяпер лёгка рабіць перапіс. А мы спачатку хадзілі па людзях і апытвалі іх: «Калі да вас можна прыйсці?». Нам называлі дату. Мы яе запісвалі, а потым прыходзілі. Аднойчы прыйшлі — а людзі сядзяць у кватэрах пры лямпах газавых. Святло раптам адключылі ў пяціпавярховіках. Мы ўсё роўна запісвалі інфармацыю на апытальныя лісты. А вам цяпер добра — ёсць сучасная тэхніка».

На гэтым і развітваемся. Далей на вуліцы сустракаем маладога мужчыну спартыўнага целаскладу з дзяўчынкай. Ён адназначна выйшаў з нейкага дома, дзе адказам на наш грукат была цішыня. Мы спрабуем яго разгаварыць, але ён кажа, што спяшаецца — вядзе дачку на трэніроўку. Нельга яму не верыць — зусім побач знаходзіцца дзіцяча-юнацкая спартыўная школа Гомельскага раёна. Літаральна ля кожнага дома перапісчыца звярае адрас і робіць пазнаку. Часам гаворыць:

— Так, гэтыя гаспадары перапісаліся па інтэрнэце.

За чарговай брамай ужо на вуліцы Азёрнай чуем сабачы брэх, дзверы адчыняюцца, ветлівая жанчына запрашае ў двор і аддае загад:

— Малыш, у будку!

Паўтараметровы кудлаты Малыш нязгодны з прыгаворам аб зняволенні, але ж на час змаўкае. Пачынаюцца знаёмыя пытанні, на якія гаспадыня дома адказвае ўпэўнена. Пры гэтым праз плячо заглядвае ў планшэт і правярае, ці ўсё пазначыла перапісчыца так, як яна кажа. Калі даходзім да памераў дома, па мясцовай традыцыі гаворыць:

— Дом у прыватнай уласнасці. 120 метраў квадратных, але пішыце — 100. І дрэў пішыце меней, а то людзі кажуць, што за кожны куст трэба будзе плаціць. У 50-я гады за кожную галаву жывёлы ж плацілі. У нашым жыцці ўсё можа быць.

Калі ўжо гутарка завершана, Крысціна прыгадвае, як праходзіў напярэдадні перапіс на адным з мясцовых прадпрыемстваў, куды перапісчыкі прыехалі ў складзе мабільнай групы:

— Мы, чатыры перапісчыкі — за адным сталом. Сеў да мяне мужчына, мы пачалі размаўляць. Калі размова зайшла пра колькасць дрэў, кустоўя на яго ўчастку, ён натуральна спалохаўся. Спытаў: «Вы з падатковай? Я не буду на такія пытанні адказваць. Пішыце паўсюль — «нуль». І гэта нягледзячы на пасведчанні і іншыя атрыбуты перапісчыка. Так і не паверыў.

Ужо пачынае цямнець і мы, прайшоўшы тры вуліцы і перапісаўшы два домаўладанні, вырашаем, што трэба на сёння заканчваць. Больш толку будзе, калі прыйсці сюды ў выхадныя дні.

Між тым і ў будныя Крысціна, як і іншыя перапісчыкі, зазірне ў кожны дом па тры разы. Калі ніхто так і не адчыніць, інфармацыю пра такія домаўладанні перадасць на перапісны ўчастак. Яшчэ мы шкадуем, што няма ў нас фітнес-браслетаў — каб праверыць, ці прайшлі за дзень неабходныя восем тысяч крокаў. Крысціна дзеліцца сваімі ўражаннямі.

— Увогуле людзі добразычлівыя. Проста складана іх застаць дома. Толькі вечарам трэба падыходзіць ці ў выхадныя. Некаторыя нават хочуць пагаманіць на іншыя тэмы. Адна жанчына на пытанне «Адкуль прыехала ў Беларусь» адказала, што з Казахстана і пачала здалёк расказваць сваю біяграфію. Людзям цікава пагутарыць. Яны не баяцца, што да іх чужы чалавек звярнуўся. Час ад часу прапануюць паесці, але я не згаджаюся.

Загадчыца стацыянарнага перапіснога ўчастка № 5 па аграгарадку Яроміна Тамара БЯРОЗКІНА расказала, што да ўдзелу ў перапісе прыцягнуты 17 чалавек. Большасць з іх — маладыя людзі 25—35 гадоў, якія працуюць у галіне адукацыі або культуры.

— Да нашага перапіснога ўчастка аднесена тры сельсаветы: Яроміцкі, Бальшавіцкі, Пакалюбіцкі. У нас працуе два стацыянарныя пункты перапісу. Мы імкнёмся максімальна даступна фармуляваць тыя пытанні, якія ёсць у анкеце для апытання. У нас ёсць сацыяльна небяспечныя грамадзяне, да якіх пойдзем толькі разам з праваахоўнікамі. Напярэдадні мабільныя групы перапісалі людзей у бальніцы сястрынскага догляду ў пасёлку Бальшавік, на прадпрыемстве «Агракамплект» і ў агракамбінаце «Паўднёвы».

Як расказала **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення — начальнік аддзела дэмаграфічнай статыстыкі і перапісу насельніцтва Галоўнага статыстычнага ўпраўлення Вольга СЕМЕНЧУКОВА**, на Гомельшчыне спосаб перапісу па інтэрнэце выкарысталі 233 858 чалавек, ці 16,6 % ад агульнай колькасці насельніцтва. Самую вялікую актыўнасць у анлайн-перапісе прадэманстравалі жыхары Чачэрскага (35,5 %), Брагінскага (28 %), Нараўлянскага (27,9 %) раёнаў.

Да 30 кастрычніка ўсё яшчэ можна прыняць удзел у перапісе насельніцтва: чакаць перапісчыка дома або самому прыйсці на стацыянарны ўчастак. У гарадах участкі працуюць з 9.00 да 20.00, у сельскіх населеных пунктах — з 9.00 да 19.00.

Ірына АСТАШКЕВІЧ, фота аўтара.

Турызм

ГАСЦЕЙ ПРЫБЫВАЕ

У Гродне віталі статысячнага бязвізавага турыста, які прыехаў з Беластока

Аляксандр Кучынскі ў Гродне ўпершыню. Ён здзейсніў экскурсіі па гістарычным цэнтры, наведаў замкі, падняўся на аглядальную пляцоўку. Юбілейнага бязвізавага турыста прывіталі мясцовыя ўлады.

grodnonews.by

Падчас сустрэчы госцю ўручылі сертыфікат на наведванне гарадскога кафэ, а таксама запрасілі ўзяць удзел у XIII фестывалі нацыянальных культур, які адбудзецца налета. Як расказаў сам Аляксандр Кучынскі, ён ужо наведваў Брэсцкую вобласць, а вось у Гродне першы раз. Горад яму вельмі спадабаўся, ён збіраецца пагасціць тут некалькі дзён.

Дарэчы, у Гродне ўжо склалася трывалая традыцыя афіцыйна сустракаць юбілейных гасцей. Сёлета такімі сталі жыхары Варшавы, Таліна, Лондана. З кожным годам колькасць бязвізавых турыстаў расце. Калі летась тут пабывала 92 тысячы, то сёлета за 10 месяцаў — пераваліла за сотню. Горад наведалі прадстаўнікі 37 краін свету.

— Важна даць магчымасць анлайн-знаёмства з рэгіёнам, — лічыць намеснік **старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ЛІСКОВІЧ**. — І мы ў гэтым кірунку актыўна працуем. Створаны інтэрактыўныя карты музеяў і цікавых падзей, веламаршрутаў рэгіёна. У нас распрацаваны і дапаўняюцца мабільныя праграмы пра Аўгустоўскі канал.

Бязвіз спрыяе і развіццю турыстычнай інфраструктуры. Напрыклад, у Гродне за два з паловай гады дзеяння бязвізавага рэжыму адкрыліся сем хостэлаў і гасцініц, звыш 40 аб'ектаў грамадскага харчавання. Гэта, у сваю чаргу, спрыяе эканоміцы горада: ствараюцца новыя рабочыя месцы, расце тавараабарот.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

І так бывае...

У Белавежскай пушчы затрыманы каратысты з Алжыра

Некалькі дзён таму ў Гомелі праходзіў Адкрыты міжнародны турнір па каратэ, у якім прыняло ўдзел каля 1000 спартсменаў сямі краін. Павінна была быць сярод іх і група каратыстаў з Алжыра. Аднак замест спаборніцтваў на татамі яны абралі іншы від «спаборніцтваў» — бег па перасечанай мясцовасці. А ў сапернікі сабе абралі брэсцкіх пагранічнікаў.

Спартсмены з поўначы Афрыкі прыбылі ў Беларусь цалкам легальным спосабам, але, мабыць, яшчэ ў сябе на радзіме вырашылі, што з тэрыторыі Беларусі змогуць збегчы ў Еўропу і больш не вяртацца дадому. Замест Гомеля яны прыехалі ў Брэст, затым накіраваліся ў пушчу. З дапамогай карты выбралі зручнае, на іх погляд, месца для перасячэння мяжы, пералезлі цераз сігналізацыйны комплекс і працягнулі рух у бок Польшчы.

Пагранічнікі зрэагавалі на работу сігналізацыі і адправіліся шукаць няпрошаных гасцей. Тыя спрабавалі схавацца, але арыентацыю на мясцовасці хутка прайгралі і былі затрыманыя.

Кожны з парушальнікаў атрымаў буйны штраф за парушэнне памежнага рэжыму і спробу парушэння Дзяржаўнай мяжы. У найбліжэйшы час замежнікі будуць дэпартаваныя за свой жа кошт з забаронай уезду на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь тэрмінам на 5 гадоў. Аб кубках і перамогах у нашай краіне ім прыйдзецца на гэты час забыцца.

Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.

Надвор'е

Залатая восень, ды яшчэ і цёплая

Бабіна лета сёлета як быццам бы спынілася

Другую дэкаду запар на тэрыторыі Беларусі ўтрымліваецца цёплае надвор'е, калі сярэднясутачная тэмпература значна перавышае норму, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Заўтра ўдзень наша краіна застанецца ў асноўным у вобласці павышанага атмасфернага ціску, які быў сфарміраваны ва ўмерана цёплай паветранай масе. Чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. Пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі туман. Вецер заходняй чвэрці ўмераны, удзень па паўночнай палове парывісты. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 3 да плюс 9 градусаў, месцамі да 11 цяпла. Удзень будзе значна цяплей, калі тэмпература паветра стане дасягаць плюс 11 — плюс 18 градусаў, а па паўднёвым захадзе — нават да 20 цяпла.

А вось у нядзелю, 27 кастрычніка, надвор'е ў нас будзе вызначаць поле паніжанага атмасфернага ціску, сфарміраванае ў цёплай паветранай масе. У гэты дзень у дзённыя гадзіны па паўночным захадзе краіны адаб'ецца ўплыў малаактыўнай франтальнай сістэмы. Уначы тэмпература паветра складзе ад плюс 6 да плюс 12 градусаў, але па паўднёвым усходзе будзе 4—6 цяпла. Удзень нас чакае камфортнае цёплае надвор'е, калі ў разгар дня будзе 13—20 цяпла, а па поўдні — да плюс 22 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

СЛЕДСТВА ПА НАВУЦЫ

КВАДРАКОПТАР ВЫХОДЗІЦЬ НА СЛЕД

Ён дэманструе флэшку: вось тут і знаходзіцца тая самая вынаходка. Перахопліваючы мой неўразумелы погляд, тлумачыць.

— Каб гэта працавала, патрэбны яшчэ беспілотнік. Уявіце сабе буйное ДТЗ на трасе, скажам, Мінск—Брэст. Агляд месца здарэння доўжыцца тры-чатыры гадзіны. І на гэты час трэба цалкам перакрыць магістраль. Беспілотнік зробіць агляд у разы хутчэй. І супрацоўніку не прыйдзецца бегаць з рулеткай. Ён потым толькі ўставіць флэшку з квадракоптара ў камп'ютар і зробіць з дапамогай здабытай інфармацыі ўсе неабходныя замеры.

Беспілотнікі ў праваахоўнай сістэме ўжо выкарыстоўваюцца ў мэтах вышуку людзей, якія заблукалі ў лесе, у шэрагу іншых экстрэмальных сітуацый. А цяпер яны змогуць займацца яшчэ і замерамі.

— ДТЗ, пажары на аб'ектах вялікай плошчы, выбухі — з нашай прыладай не трэба губляць шмат часу і сіл, — кажа вучоны. — Уяўляеце наступствы выбуху, калі рэчавыя доказы раскінуты на вялікую адлегласць на значнай тэрыторыі. Трэба высветліць магутнасць выбуху, іншыя абставіны, якія цікавяць следства. І вымярэнні — вялікая частка гэтай работы. З'яўленне беспілотных лятальных апаратаў істотна аблегчыла работу міліцыі, а ў нас атрымалася яшчэ больш удасканаліць гэты працэс. Наша кафедра сумесна з кафедрай квантавай фізікі і оптаэлектронікі БДУ стварыла сродак, які дазваляе рабіць не толькі фота- і відэафіксацыю на месцы здарэння, але і атрымліваць адпаведную вымяральную інфармацыю з дакладнасцю плюс-мінус пяць сантыметраў з вышыні 100 метраў. Нацыянальным цэнтрам інтэлектуальнай уласнасці ўжо пацверджана наша заяўка на атрыманне патэнта і да канца года, спадзяёмся, атрымаем гэты ахоўны дакумент.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Для Ягора Лаппо гэта вынаходка, свайго роду, справа гонару. Пэўны час ён працаваў экспертам-крыміналістам і ў складзе следча-аператыўнай групы неаднаразова выязджаў на агляд месцаў здарэння. І наколькі гэта карпатлівая і адказная работа, ведае добра. Усё, што эксперт унясе ў пратакол агляду, потым будзе служыць доказам у судзе. Ад сумленасці спецыяліста залежыць, па сутнасці, і прысуд.

Чуткі пра тое, што ў інстытуце МУС працуюць над такой карыснай прыладай, распаўсюдзіліся нават за мяжу. Мы гутарылі з Ягорам за некалькі гадзін да таго, як ён адправіўся на міжнародную навуковую канферэнцыю ў Екацярынбург. Яго даклад быў менавіта на гэтую тэму.

ПАДАБАЕЦЦА ЎДАСКАНАЛЬВАЦЬ ПРАЦЭС

Гэта цяпер Ягор магіляўчанін, а да гэтага жыў і працаваў у Мінску. Дарэчы, асабіста прысутнічаў на ўсіх гучных справах, звязаных з выбухамі ў беларускай сталіцы — на Дзень Незалежнасці ў 2008 годзе і ў красавіку 2011 года, калі здарыўся тэракт у метро.

— На выбух у метро выязджаў у якасці ўдзельніка агляду месца здарэння, — успамінае ён той жахлівы дзень. — Мы вынеслі з метро, здаецца, некалькі тон рэчавых доказаў. Узарваную лаўку з хлопцамі цягнулі па выключанаму эскалатару. Але ж знайшлі ўсе доказы таго, што чалавек, які ўчыніў выбух каля стэлы на Дзень Незалежнасці і ў метро, — адна і тая асоба. Адно апісанне сабраных на месцы злачынства рэчавых доказаў склала цэлы том з 300 старонак. І ўсе вымярэнні рабіліся выключна ўручную. Як бы нас тады выручыў такі вось беспілотнік-вымяральнік.

Суразмоўнік прызнаецца, што яго вельмі крыўдзіць, калі кажуць, што міліцыянеры заўсёды знойдуць на каго павесіць злачынства. Маўляў, так разважаюць толькі дылетанты. І ён заўсёды кажа курсантам, што нельга судзіць аб злачынстве, не маючы першасных дакументаў. Можна толькі меркаваць. А следчыя органы бачаць усю карціну.

Беспілотнік — гэта ўжо другое вынаходства Ягора. Ім жа ў суаўтарстве з той жа кафедрай БДУ быў распрацаваны праграмны апаратны комплекс, які дазваляе праводзіць на экране камп'ютара вымярэнні слядоў зброі на стрэляных кулях і гільзах. Распрацоўка таксама нарадзілася не на пустым месцы. Калі суразмоўнік працаваў у экспертнай службе, ён спецыялізаваўся на экспертызе халоднай зброі і судова-балістычных даследаваннях. І таксама марыў скараціць працэс атрымання неабходнай для раскрыцця злачынства інфармацыі. Таму, калі паступіў у ад'юнктуру Акадэміі МУС, узяў гэтую тэму для напісання сваёй дысертацыі. Як высветлілася, з 1938 года не было ніводнай навуковай работы па балістыцы. Падчас вывучэння тэмы вучоны-пачатковец пазнаёміўся з прафесарам кафедры квантавай фізікі і оптаэлектронікі БДУ доктарам тэхнічных навук Уладзімірам Казловым, з якім супрацоўнічае дагэтуль. Іх першая распрацоўка прайшла практычную апрабацыю і была ўключана ў рэестр экспертных методык. Сёння Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь выкарыстоўвае яе ў сваёй штодзённай дзейнасці.

ПРАФЕСІЯ Ў СПАДЧЫНУ

Ягор Лаппо — патомны міліцыянер. У міліцыі працавалі яго дзед і бацька. Ён таксама пасля школы атрымаў юрыдычную спецыяльнасць ў Беларускім інстытуце правазнаўства. А пасля службы ў арміі адразу ж пайшоў служыць у міліцыю. Гэта была яго шчырая мара. Тут жа спаткаў і свой лёс. Яго абранніца Ганна — спецыяліст па судова-экспертнай дзейнасці. «Налета, спадзяюся, выйдзе вучэбны дапаможнік, дзе яна будзе маім суаўтарам», — з гонарам удакладняе суразмоўнік.

Цікавасць да навуковай дзейнасці, лічыць ён, у яго з дзяцінства. Успамінае, з якім захапленнем займаўся радыёэлектронікай і эксперыментаваў з фотасправай. Дасканала ведае працэс атрымання фота з плёнкі. «Нядаўна паказаў жонцы, яна была ў шоку, — усміхаецца ён. — Калі яна нарадзілася, такім ужо ніхто не займаўся».

Да навуковай дзейнасці ён прыцягвае і будучых міліцыянераў. Курсант 4 курса сяржант міліцыі Анастасія Кавальчук адна з паспяховых вучаніц Ягора Лаппо.

— Мы з ёй напісалі навуковую работу, дзе таксама закранулі магчымасць выкарыстання квадракоптара ў праваахоўнай судовай экспертнай дзейнасці, — кажа ён. — З яе ўдзелам праводзілася і апрабацыя вынаходства. Летась мы ўзялі каля пяці прызавых дыпломаў на міжнародных конкурсах за гэтую работу. А ва Уральскім юрыдычным інстытуце МУС Расіі дзяўчына стала лаўрэатам у намінацыі найлепшыя практычныя рэкамендацыі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота прадстаўлены інстытутам МУС.

У ТЭМУ

Уладзімір БАРЫСЕНКА, прарэктар па навуковай рабоце інстытута МУС:

— Асноўная дзейнасць, якую вядзе інстытут — гэта падрыхтоўка будучых высокакваліфікаваных супрацоўнікаў міліцыі. Неад'емная складальная частка работы любой ВНУ — гэта навуковая дзейнасць прафесарска-выкладчыцкага персаналу і прыцягненне да яе курсантаў. Прычым не толькі ў рамках вучэбнага працэсу, але і па-за імі. Нашы курсанты, як і выкладчыкі, актыўна ўдзельнічаюць у розных навуковых форумах і канферэнцыях рэгіянальнага, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. З першага курса выяўляем людзей, здольных займацца навукай. Адна з задач — абнаўленне вучэбна-педагагічных кадраў, у тым ліку за кошт адораных выпускнікоў. Ёсць у нас і сістэма заахвочванняў для будучых міліцыянераў — Палажэнне аб мерах стымулявання навукова-даследчай дзейнасці курсантаў. А сёлета мы распрацавалі і заснавалі грант на выкананне навукова-даследчай работы ў вобласці навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу і для выкладчыкаў. Першыя вынікі конкурсу будзем падводзіць у наступным годзе. За кошт пазабюджэтных сродкаў будзем заахвочваць выкладчыкаў больш актыўна займацца навуковай дзейнасцю. Гэта дасць магчымасць удасканальваць метадычнае і навуковае суправаджэнне вучэбнага працэсу, што будзе садзейнічаць больш глыбокаму засваенню ведаў па адпаведных прадметах і дысцыплінах. Акрамя гэтага, у нас у інстытуце штогод адбываецца да пяці міжнародных канферэнцый, у тым ліку анлайн. У іх актыўна прымаюць удзел калегі з Расіі, Латвіі, Цэнтральнай Азіі.

Крымінал, здарэнні

ВЫКРАЎ РЫБУ Ў... КАНКУРЭНТА ПА БІЗНЕСЕ

Перанёс яе мяхамі з чужой сажалкі ў сваю

У міліцыю звярнуўся кіраўнік фермерскай гаспадаркі з Кобрынскага раёна, які паведаміў, што ўначы невядомы з сажалкі на тэрыторыі гаспадаркі выкраў рыбу.

Аператыўнікам фермер расказаў, што мае ў карыстанні некалькі сажалак для развядзення рыбы. Напярэдадні ён вылавіў 180 кілаграмаў карпа, таўсталобіка і белага амура і пакінуў да раніцы асобна, маючы намер прадаць на суботнім кірмашы. Аднак на наступны дзень мужчына ўбачыў толькі пусты садок. Як паведаміла УУС Брэсцкага аблвыканкама, шкода ацэньваецца больш як у 800 рублёў.

Праваахоўнікі ўстанавілі, што да крадзяжу датычны непрацуючы аднавясковец фермера, які таксама мае... рыбаводную сажалку. Зламыснік ведаў, што канкурэнт падрыхтаваў партыю тавару для рэалізацыі. Выкрадзеную рыбу мужчына мяшкамі перацягнуў у свой вадаём.

ПАВЕДАМІЛА АБ ІЛЖЫВЫМ РАЗБОІ

Каб атрымаць... бальнічны

На лінію «102» у аператыўна-дзяжурную службу Маладзечанскага РАУС 25-гадовая гараджанка паведаміла аб тым, што невядомы мужчына выкраў сумку з кашальком, у якім знаходзілася 50 рублёў, і парэзаў ёй рукі. Па словах заяўніцы, інцыдэнт адбыўся ўвечары ў Парку культуры і адпачынку імя Перамогі. Аднак у міліцыю дзяўчына звярнулася праз гадзіну, вярнуўшыся дадому.

Да грамадзянкі неадкладна выехалі супрацоўнікі праваахоўных органаў. Аднаўляючы карціну таго, што адбылося, у расповедзе пацярпелай яны выяўлялі ўсё больш непаразуменняў. У выніку аператыўнікі выкрылі дзяўчыну ў хлусні. Заяўніца прызналася, што паведамленне аб разбоі ілжывае, патлумачыўшы, што такім чынам спрабавала патрапіць у бальніцу.

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку ўстанавілі, што парэзы на руках дзяўчына нанесла сабе сама. Для гэтага яна ўзяла кухонны нож у суседа, таму што свой быў тупы. Брыгада хуткай дапамогі даставіла грамадзянку ў прыёмнае аддзяленне, але пасля агляду спецыяліста пацыентку адпусцілі дадому. Тады ёй і прыйшла ў галаву думка паведаміць у міліцыю аб разбойным нападзе.

Па гэтым факце праводзіцца праверка. Як паведамляе УУС Мінскага аблвыканкама, за загадзя ілжывы данос заяўніцы пагражае да пяці гадоў пазбаўлення волі.

НА ДАЧЫ АДПАЧЫЛА «ЎДАЛА»

Хлопец правёў вечар у прыемнай кампаніі, а яго маці пазбавілася сваіх зберажэнняў

Жыхарка аднаго з садовых таварыстваў у Брэсцкім раёне вярнулася з камандзіроўкі. Трапіўшы дадому, жанчына вырашыла пералічыць грошы, але там, дзе яны захоўваліся, іх не аказалася, як не было і залатога пярсцёнка ў шкатулцы. Яна спытала сына, які заставаўся на гэты час дома, ці не перакладаў ён купюры і ці не браў упрыгажэнне, на што атрымала адмоўны адказ.

Гаспадыня дома звярнулася ў міліцыю. У гутарцы з сынам заяўніцы супрацоўнік крымінальнага вышуку Брэсцкага РАУС даведаўся, што ў госці да хлопца прыходзіў яго сябар. У адзін з вечароў яны пакінулі запіс аб пошуку дзвюх дзяўчат для баўлення вольнага часу на сцяне суполкі ў сацыяльнай сетцы. На іх паведамленне адгукнуліся дзве сімпатычныя брастаўчанкі, якіх хлопцы адразу ж запрасілі на вячэру. Маладыя людзі хутка знайшлі паміж сабой агульную мову, таму дзяўчаты яшчэ некалькі разоў прыязджалі за горад. Па словах сына, з сябрам ён знаёмы вельмі даўно, а госці былі ветлівыя і выклікалі давер з першых слоў, таму, на яго думку, ніхто з іх не мог здзейсніць крадзеж.

Аднак праваахоўнік вывучыў перапіску маладых людзей у інтэрнэце і ўстанавіў, што адна з дзяўчат у свае 20 гадоў ужо некалькі разоў пападалася на парушэнні закону. У ходзе аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў былі атрыманы доказы датычнасці да крадзяжу менавіта гэтай жыхаркі горада над Бугам. Тут, у абласным цэнтры, яна і была затрымана. Дзяўчына расказала міліцыянеру, што ў першы ж вечар знаёмства з хлопцамі ветлівы гаспадар адлучыўся па справах, а сам папрасіў сябра прыбрацца, дзяўчыны падахвоціліся дапамагчы. Падчас уборкі затрыманая і ўбачыла тое, што вырашыла прыбраць да рук. Па інфармацыі УУС Брэсцкага аблвыканкама, за некалькі разоў яна вынесла больш за тысячу ўмоўных адзінак валюты і пярсцёнак, які здала ў ламбард. Грошы патраціла з сяброўкай, адпачываючы ў начных установах. На ўсе пытанні прыяцелькі адказвала, што гэтыя шчодрыя падарункі ёй дасылаюць з-за мяжы.

Па факце крадзяжу ўзбуджана крымінальная справа.

Сяргей РАСОЛЬКА.



З ГОРАМ, АЛЕ БЕЗ БЯДЫ?

У незабыўным 1944-м вайна пакацілася ў бок Германіі, а наша няпоўная сям'я — мама, брацік і я (тата — на фронце, сястрычка памерла ў бежанцах) — вярнуліся ў вызвалены Віцебск. Паверыць у гэта ўжо немагчыма, але ж вызваліцеляў па асобных звестках сустракала 108 чалавек — **усё** (!) насельніцтва горада. Віцебск ляжаў у руінах, наш дом — таксама. За вялікае шчасце было пасяліцца ў бараку: дзе жылі 11 сем'яў, і кожная з іх займала па адным пакойчыку плошчай у 14 метраў. На іх, як у тым анекдоце, і зала, і кухня, і спальня з вітальняй — праўда, без перагародак.

А за баракамі быў завод, які адразу ж пачалі адбудоўваць, і... вялізная яміна. Пад нешта, відаць, капалі катлаван. Зямля з яго, утварыўшы досыць высокі насып, ляжала побач і зімой пакрылася снегам, а вада — замерзла. Такім чынам зімою ў нас, дзяцей, з'явілася ці не найлепшае месца для забаў: сапраўдная коўзанка, з горкай. Да таго ж побач з імі была завадская агароджа, ля яе ўзвышаўся слуп з пражэктарам. Вечарам яго ўключалі і тым самым як бы дазвалялі нам, забыўшыся на пастаянны голад і холад, катацца да позняга вечара ці хоць сабе і да ночы — на дошках, на санках, нават на каньках.

У суседа Валодзькі яны былі, і ён каму-нікаму даваў...

Неяк паабяцаў быў мне. Але ж яго канькі трэ было вяровачкамі прывязваць да бурачак. А бурачкі ў нас з мамай адны...

Помню, ці не цэлую вечнасць чакала, пакуль яна вернецца з работы!

Калі прыйшла, на дварэ ўжо сцямнела, што мяне зусім не палохала. Я ўскінула на плечы маміну ватоўку, закруціла яе хустку, прывязала канькі і на вуліцу.

На коўзанцы нікога з дзяцей не было. А я і рада, бо ніхто ж не ўбачыць, што крыва еду, што падаю на лёд, што ўстаю...

Але ж...

У жыцці (я потым не раз пераканалася!) так не бывае, каб ніхто нічога не бачыў — нехта абавязкова знойдзецца.

У той вечар, напрыклад, наш новы сусед дзядзька Сеня. Ён выйшаў з барака, высыпаў смецце і стаў глядзець у мой бок. Думаю: ну і няхай сабе! Дзе я і дзе ён — не пазнае. А калі і так, то што з таго: я, забыўшыся на ўсё, еду, падаю на лёд, падымаюся, зноўку еду — ужо хутчэй, смялей... Мне горача... Мне добра!

А тым часам — «спінай» бачу — ля смеццевых скрынак збіраюцца людзі — з нашага барака, з суседняга. Усе глядзяць на маё «фігурнае катанне», а потым, здаецца, пачынаюць ісці — па лёдзе, да мяне. Я таксама кірую насустрач, набліжаюся і бачу, як дзядзька Сеня (ён першым ішоў) у роспачы плюе на лёд:

— Цьфу ты! Гэта ж Зоя...

А ён — як потым дазналіся — думаў, што Соня, мама мая — не іначай як розум страціла: за баракам на каньках катаецца.

Убачыўшы натоўп, мама, дарэчы, таксама да яго прыйшла. Спытала ў некага, што зрабілася?

— Што-што, — сказалі ёй заднія, — бяда: жанчыне, кажуць, пахаванка прыйшла, а ў яе дзеці малыя. Дык яна, бач, з глузду з'ехала...

— Хто?.. Якая жанчына, — хацела высветліць мама, але пытанні яе заглушыў рогат. Наш сусед Сцяпан Чарнавус сваёй адзінай рукой (другую пакінуў на фронце) абняў матулю за плечы, сказаў:

— Няма бяды, Соня! Ідзі дадому, а то, крый бог, застудзішся, дык і будзе...

Вось так мы жылі — з горам, з бядою і ў той жа час, як быццам, без.

Зоя Наваенка,

г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.

ПАГРЭЎСЯ...

Зіма ў той год была марознай і вельмі снежнай: з вёскі, помню, проста не выехаць... Толькі з часам дарогу пачысцілі, праўда, у адзін след, гэта значыць, утварылі ў гурбах глыбокі тунель — абы машыне якой праехаць.

Дык вось недзе ў Піліпаўку, у добры мароз, былі ў мяне справы ў мястэчку. Пакуль іх уладзіла, — апошні аўтобус сышоў. Трэба, значыць, пехатой ісці — шэсць ці сем кіламетраў... Што ж — гэта не ў навіну ды і дарога добра знаёмая... Адзінае — вечарэе ўжо, і лес наперадзе ледзь не да самай вёскі.

Іду, спяшаюся. Раптам бачу — наперадзе ў гэтым «тунелі» нешта чарнеецца. Падступаю бліжэй — чалавек і нават знаёмы — дзядзька Антось з суседняга хутара. Спіць, бедачына. П'яны..

— Вам нядобра? — пытаюся, ледзь раскатурхаўшы.

Той маўчыць, спрабуе ўстаць, але ж ногі зусім не слухаюць. Прыйшлося дапамагчы: падняліся мы з дарогі, ускараскаліся на снежны «перавал», спусціліся, трохі прасунуліся па сцежцы, што вяла да хутара. А далей я ўжо спытала ў дзядзькі:

— Знаеце, куды ісці?

Кажа:

— Знаю: дамоў.

Значыць, думаю, нідзе не дзенецца, неяк дапаўзе (брэх сабакі з хутара чуваць)... Развітваюся з ім, прастую назад на дарогу, як раптам з-за спіны крык: дзядзька Антось махае мне рукой, тупае следам...

Я насустрач, каб затрымаць, не даць яму «выпаўзці» на бальшак, а той яшчэ здалёк пытае:

— Дзе мая сумка?

— Ды нічога, — кажу, — пры вас не было.

— Як гэта не было? — абураецца дзядзька. — Была... З селядцамі...

Яшчэ раз кажу, што не. Ён — верыць ці не верыць, але ж змаўкае. Можа, таму што ў руках у мяне маленькая дамская сумачка, у якую селядца ну ніяк не пакладзеш, а можа, пазнае, хто я, бо з татам яны добра знаёмыя...

Так што ўздыхнуў п'яны, павярнуўся і папоўз дахаты, да жонкі на разбор.

І я пайшла, праўда, з іншым настроем: то прыемна было (як-ніяк дапамагла чалавеку, бо ці мала што — цямком, на вузкай дарозе...), то раптам прыкра. Ну сапраўды, дзе ж яго сумка? Няўжо і праўда была ды нехта ўзяў?

...Пытанні гэтыя непакоілі, можа, з тыдзень, пакуль зноў не паехала ў мястэчка. І там ужо — больш не марудзіла, паспела на аўтобус. Заходжу ў салон і бачу — на пярэднім сядзенні дзядзька Антось размясціўся. Усміхаецца мне, вітаецца і з радасцю паведамляе, што знайшліся яго селядцы!

— Гэта ж я тады, — кажа, — аўтобуса чакаў і змёрз як сабака. Да знаёмых зайшоў, трохі пагрэўся і ходу, а сумка ў іх засталася.

Добрыя, значыць, у дзядзькі знаёмцы, калі ён, як кажа, толькі крыху пагрэўся і потым нават на снезе не мёрз, а калі б даўжэй пасядзеў...

Гэта я да таго, што зіма не за гарамі. І хай цяпер яны не такія марозныя ды снежныя, сагравацца ўсё роўна лепш з розумам.

Леанарда Аляшкевіч,

г. Смаргонь.

ЗЛАВІЛА БАБА ЗЛОДЗЕЯ

Першыя саўгасы былі ў нас досыць вялікімі. Ад цэнтральнай сядзібы да нейкай вёскі, здаралася, кіламетраў з пятнаццаць — дырэктар нячаста наязджаў... Брыгадзір там быў і цар, і бог, і воінскі начальнік. Ад яго залежала, каму калі на якія работы пайсці, дзе бульбы пасадзіць, як сена ўкасіць карове і г. д.

Той вёсцы (адрас па зразумелых прычынах паведамляць не буду) на брыгадзіра пашчасціла. Валодзя быў чалавекам справядлівым і памяркоўным. Да таго ж — былы партызан і гаспадар, якіх пашукаць: дыхтоўную хату сабе паставіў, трое дзяцей гадаваў, сталярнічаў, людзей разумеў...

А вось пра ягоную жонку такога не скажаш. Яго Манюся хіба начальству ўмела дагадзіць (ведала дарожку і ў кантору, і ў сельсавет), а вось вяскоўцаў не паважала — дзёрзкай была, ганарыстай... Дома камандавала мужам ды дзецьмі, а хацела, каб і брыгадай яшчэ.

Вось людзі і стараніліся яе, лішняе слова баяліся сказаць — абыходзілі тое ліха ў надзеі, што будзе ціха, а яно ўзяло ды грымнула, прычым так нечакана...

Ідзе, значыць, чарговая пасяўная кампанія. Мужчыны падводамі возяць насенне. З тым «караванам» і сам брыгадзір. З загадчыкам склада паціху дамовіўся — ускінуў на воз два мяшэчкі непратраўленай пшаніцы для сваіх курэй. Потым у ельніку непадалёк ад вёскі іх згрузіў — прыхаваў, каб вечарам забраць.

ШАЛІ. Надыходзіць нялёгкі тыдзень, бо назбіралася шмат спраў, якія лепш зрабіць не адкладаючы. У пачатку тыдня канкурэнты ці калегі могуць выставіць вас не ў самым выгадным святле. Захоўвайце спакой і пазітыўны настрой. Некаторыя няўвязкі ў справах могуць праследаваць вас, але ў сярэдзіне тыдня ўсе абставіны зменяцца ў лепшы бок. У пятніцу інтуіцыя падкажа правільнае рашэнне ў сітуацыі, якая склалася.

СКАРПІЁН. Вы будзеце знаходзіцца ў добрым гуморы практычна ўвесь тыдзень. Галаву будуць перапаўняць ідэі, якія хутка прынясуць прыбытак. Вы апыняцеся запатрабаваным і практычна незаменным у дзелавых пытаннях чалавекам. Але не забывайце і пра асабістае жыццё. Праявіце свае пачуцці і найлепшыя якасці. Гэта ацэняць.

СТРАЛЕЦ. Тыдзень абяцае быць дастаткова актыўным і напружаным. Затое пры жаданні, скарыстаўшыся абставінамі, будзе шанц многага дасягнуць. Вам спатрэбяцца такія якасці, як дыпламатычнасць і ўменне прадбачыць найбліжэйшую будучыню. Аўторак — прыдатны дзень для новых знаёмстваў. Праяўляйце настойлівасць пры адстойванні сваіх інтарэсаў, асабліва ў сераду. Абстаноўка ў цэлым абяцае быць спакойнай, можна злёгку расслабіцца. Дазвольце сабе не думаць пра работу ў выхадныя.

КАЗЯРОГ. Тыдзень спрыяльны для новых спраў і пачынанняў. Ваша таварыскасць можа прынесці добрыя вынікі, толькі не выдайце чужыя тайны. На рабоце начальства будзе задаволена вашымі дасягненнямі. Паспрабуйце ў чацвер не прапусціць цікавую дзелавую прапанову, і ў вас з'явіцца шанц пашырыць сваю справу і набыць новых надзейных партнёраў. У пятніцу будзьце асцярожныя, не прымайце паспешлівых рашэнняў, якія датычацца асабістага жыцця.

ВАДАЛІЙ. Вам проста неабходна загадзя пралічваць свае дзеянні і словы. Пошук залатой сярэдзіны павінен стаць асноўным заняткам на гэтыя дні. Самае нязначнае адхіленне ад дакладнай стрыманай і прадуманай лініі паводзін — і вас чакаюць малапрыемныя наступствы. У сярэдзіне тыдня можа актывізавацца асабістае жыццё. Сустрэча з сябрамі ў суботу абяцае спрыяльныя перамены.

РЫБЫ. Адчуеце прыліў сіл, будзеце ў выдатнай форме. Даверце частку спраў надзейным партнёрам або калегам, за сабой жа пакіньце самае галоўнае. Паспрабуйце абяцаць толькі тое, што зможаце выканаць. У чацвер будуць паспяховымі дзелавыя паездкі і перагаворы. У пятніцу паступіць цікавая інфармацыя, якая вельмі спатрэбіцца ў найбліжэйшы час. У нядзелю пабудзьце з сям'ёй.

Даты Падзеі Людзі

25 КАСТРЫЧНІКА

У краіне

1913 год — нарадзіўся Уладзімір Паўлавіч Цаслюк, кінааператар і рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. У час Вялікай Айчыннай вайны франтавы кінааператар, удзельнічаў у здымках фільмаў «Разгром нямецкіх войск пад Масквой», «Дзень вайны» і іншых. З 1946 года на кінастудыі «Беларусьфільм» здымаў хроніку, дакументальныя і навукова-папулярныя фільмы. З 1960-х гадоў выступаў і як рэжысёр: фільмы «Сустрэча герояў Брэста», «Штрыхі да партрэта», «Балгарскія сустрэчы». Памёр у 1977 годзе.

1914 год — нарадзіўся (вёска Кашалёва, цяпер у Буда-Кашалёўскім раёне) Казімір Паўлавіч Буслаў, беларускі філосаф, акадэмік НАН Беларусі, доктар філасофскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Пад яго кіраўніцтвам падрыхтаваны і апублікаваны кнігі, у якіх аналізуюцца сацыяльныя змены ў асяроддзі рабочага класа, сялянства, інтэлігенцыі Беларусі ў працэсе сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 1983 годзе.

1929 год — нарадзіўся (вёска Старая Алешня Рагачоўскага раёна) Мікола Гроднеў, беларускі пісьменнік. Настаўнічаў, працаваў у перыядычным друку. Аўтар зборнікаў прозы «За бацькоўскім парогам», «Цяжкае шчасце», «Вясна была...», аповесцяў, апавяданняў, нарысаў, дакументальнай прозы, гумарыстычнага зборніка «Клін клінам». Памёр у 2011 годзе.

1934 год — нарадзіўся Карлас Шэрман, беларускі перакладчык, паэт. У 1964—1980 гадах працаваў у Фундаментальнай бібліятэцы імя Я. Коласа АН Беларусі. Пераклаў з беларускай мовы на іспанскую зборнік лірыкі «Мая Бесядзь» А. Куляшова, творы Я. Купалы і Я. Коласа, Р. Барадуліна, В. Быкава, І. Шамякіна. Перакладаў таксама творы з іспанскай на беларускую мову. Памёр у 2005 годзе.

У свеце

1922 год — у Савецкай Расіі завяршылася Грамадзянская вайна. Увосень 1922 года ў Расіі ішоў апошні этап Грамадзянскай вайны, узброенага канфлікту, які разгарнуўся ў маштабах усёй краіны паміж савецкімі і антыбальшавіцкімі сіламі. Да пачатку 1920 года бальшавікі захапілі ўладу на асноўнай частцы тэрыторыі былой Расійскай імперыі. З сакавіка 1920-га асноўная барацьба паміж «чырвонымі» і «белымі» адбывалася на ўскраінах краіны. У чатыры гадзіны дня 25 кастрычніка 1922 года часці Народна-рэвалюцыйнай арміі Далёкаўсходняй рэспублікі (НРА ДВР) пад камандаваннем І. Убарэвіча ўвайшлі ва Уладзівасток. Судны з рэшткамі японскіх і белагвардзейскіх войск спешна пакінулі горад за дзве гадзіны да гэтага. Праз тры тыдні Далёкі Усход стаў складовай часткай Савецкай рэспублікі. Хоць узяцце Чырвонай Арміяй Уладзівастока 25 кастрычніка 1922 года традыцыйна лічыцца датай заканчэння Грамадзянскай вайны, аднак розныя баі вяліся яшчэ прыблізна год, а асобныя белапартызанскія атрады дзейнічалі некалькі гадоў.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.56	17.51	9.55
Віцебск —	7.48	17.38	9.50
Магілёў —	7.46	17.41	9.55
Гомель —	7.39	17.42	10.03
Гродна —	8.10	18.07	9.57
Брэст —	8.07	18.11	10.04

Месяц

Апошняя квадра
21 кастрычніка.
Месяц у сузор'і Шаляя.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Івана, Кузьмы, Марціна, Мікалая.*
К. *Дар'і, Інгі, Пятра.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Гараскоп для ўсіх знакаў задыяка.

Увесь дзень будзе хацецца спаць, але ўвечары гэта пройдзе.

— Мілы! Я проста зараз смажу бульбу напалову голая...

— Выязджаю!

— Пагарэзім?

— Ты там усё не з'еш!

У Старажытным Егіпце была багіня рэўнасці, і клікалі яе Тытамзкім.

Істэрыка ў 16 гадоў: выбіваеш дзверы з нагі, разбіваеш смартфон аб сцяну, крычыш.

Істэрыка ў 26 гадоў: дзверы каштуюць 300 рублёў, установка яшчэ 100, за смартфон і ноўтбук яшчэ выплачваць крэдыт. Проста крычыш.

Істэрыка ў 36 гадоў: крычаць нельга — дзеці спяць. Проста сядзіш.

Гультаі ўсё робяць хутка, каб хутчэй адкараскацца ад работы. І якасна, каб потым не перарабляць.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3529.

Нумар падпісаны ў 19.30 24 кастрычніка 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

25 кастрычніка 2019 г. № 43 (528)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

Фота БелТА.

НЕ АБЯЦАЦЬ, А ДЗЕЙНІЧАЦЬ

У хуткім часе жыхары нашай краіны будуць абіраць сваіх прадстаўнікоў у нацыянальны парламент новага склікання: зараз адбываюцца сустрэчы, ідзе агітацыя і, безумоўна, гучаць абяцанні патэнцыйных народных выбраннікаў. «МС», у сваю чаргу, падтрымліваючы тэматыку электаральнай актыўнасці, вырашыла паглядзець, а якімі формамі і метадамі работы карысталіся іх папярэднікі? Ведаеце, ёсць шмат цікавага і ўнікальнага. Напрыклад, вопыт аб'яднання намаганняў дэпутата Палаты прадстаўнікоў з калегамі з мясцовых Саветаў па вырашэнні праблем насельніцтва ў сваёй акрузе — аб ім вы даведаецеся з матэрыялу «Камандны залік». На нізавым узроўні таксама працуюць самаадданыя і неабыякавыя да праблем выбаршчыкаў людзі, з такімі чытачы пазнаёмяцца ў матэрыяле «Чалавек, якому больш за ўсіх трэба». І нарэшце, аб заканатворчай дзейнасці і чаканнях выканаўчай улады ад будучага складу дэпутацкага корпуса раскажа губернатар Гродзеншчыны Уладзімір Краўцоў (які, дарэчы, ведае дэпутацкую работу як ніхто іншы) у матэрыяле «Пазбегнуць прававых тупікоў».

Працяг тэмы стар. 4,14

ВЫБАРЫ-2019

Кошт агітацыі

Больш за 20 % кандыдатаў у дэпутаты ўжо адкрылі спецыяльныя рахункі для збору добраахвотных ахвяраванняў у выбарчыя фонды. Пра гэта ў відэаінтэрв'ю на сайце Нацыянальнага прэс-цэнтра паведаміла старшыня ЦВК Лідзія ЯРМОШЫНА.

Паводле інфармацыі БелТА, кіраўнік Цэнтрвыбаркама праінфармавала, што паўтары сотні чалавек адкрылі рахункі для стварэння асабістых фінансавых фондаў, за кошт якіх яны будуць купляць эфірны час, вырабляць друкаваную прадукцыю. «Гэта ўжо больш за 20 % ад усіх кандыдатаў», — сказала яна, удакладніўшы, што лічба змяняецца літаральна кожную гадзіну.

Вялікая колькасць кандыдатаў (на першым месцы Мінск) звярнулася з заяўкамі аб тым, што яны будуць праводзіць адкрытыя агітацыйныя мерапрыемствы. Частка прэтэндэнтаў на дэпутацкія мандаты звярнулася з заявамі аб выдзяленні закрытых памяшканняў для сустрэч з выбаршчыкамі. Тут лідзіруе Мінская вобласць.

Лідзія Ярмошына мяркуе, што першыя інфармацыйныя спрэчкі паміж кандыдатамі ў дэпутаты не за гарамі, паколькі некаторыя ўспрымаюць гэтую кампанію як барацьбу з абвінавачваннямі. «Натуральна, гэта можа выклікаць папрокі ў тым, што яны парушаюць правілы, якія прадугледжаны артыкул 47 Выбарчага кодэкса, дзе ўтрымліваюцца абмежаванні, што не павінна ўтрымліваць перадвыбарная агітацыя і прапаганда. Таму тут, я думаю, таксама хутка ўсё забурліць», — адзначыла яна.

Дарэчы, прадугледжаныя ў Выбарчым кодэксе абмежаванні не датычацца сацыяльных сетак. «Але калі кандыдат у дэпутаты будзе і ў сацсетках дапускаць у сваіх выступленнях паклёп, абразы, распальваць сацыяльную варожасць, заклікаць да гвалтоўнага звяржэння канстытуцыйнага ладу — гэта падстава для адмены рэгістрацыі ў якасці кандыдата ў дэпутаты», — растлумачыла старшыня ЦВК.

Нагадаем, што выбары ў Палату прадстаўнікоў прызначаныя на 17 лістапада.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Старт дадзены!

У Савеце Рэспублікі адбылося пасяджэнне Камітэта па Дзяржаўных прэміях. стар. 2

23-я ў рэйтынгу

Беларусь з'яўляецца лідарам у рэгіёне па арганізацыі работы па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. стар. 3

Дома лепей

У Віцебску прайшоў першы абласны форум замяшчальных сем'яў. стар. 14

Ні прайсці, ні праехаць!

Калі заасфальтуюць дарогу, што вядзе да садовага таварыства «Івушка»? стар. 15

Народны праект

Пераправу за ваколіцай аграгарадка Рычоў, што на Гомельшчыне, аднаўлялі талакой. стар. 16

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

СТАРТ ДАДЗЕНЫ!

На мінулым тыдні ў Савеце Рэспублікі адбылося пасяджэнне Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь.

Як паведаміў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч, адкрываючы яго, галоўная мэта сустрэчы — даць старт рабоце падкамітэтаў па правядзенні конкурсу 2020 года на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі і ў сферы літаратуры, мастацтва і архітэктуры.

Ён нагадаў, што 16 жніўня быў прыняты Указ № 589, згодна з якім камітэт абноўлены па мэтавых задачах і сваім складзе. Зараз ён складаецца з 78 чалавек — вядомых кіраўнікоў, спецыялістаў-практыкаў, майстроў літаратуры, архітэктуры і мастацтва нашай краіны. У тым ліку 43 чалавекі ўваходзяць у склад падкамітэта ў галіне навукі і тэхнікі і 30 экспертаў — у склад падкамітэта ў вобласці літаратуры, мастацтва і архітэктуры. Абноўлены прэзідыум, які ўзначальвае Міхаіл Мясніковіч, складаецца з сямі чалавек.

Пачынаючы з 2016 года, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь прысуджае Дзяржаўныя прэміі адзін раз на чатыры гады. Трэба сказаць, што раней гэта адбывалася часцей — раз у два гады. Па словах спікера верхняй палаты парламента, больш доўгі перыяд надае большую галоснасць працэсу вылучэння кандыдатаў, дае магчымасць больш шырокага абмеркавання ў грамадстве і дазваляе максімальна аб'ектыўна вызначыць дасягненні саіскальнікаў.

Старшыня Камітэта па Дзяржаўных прэміях падкрэсліў, што яе прысуджэнне — гэта найвышэйшае прызнанне заслуг дзеячаў навукі і тэхнікі, літаратуры, мастацтва і архітэктуры перад грамадствам і дзяржавай. Памер яе складае 3500 базавых велічынь (89 тысяч беларускіх рублёў) і адрасуецца як аднаму саіскальніку, так і калектыву аўтараў не больш як з шасці чалавек. Дарэчы, прэтэндаваць на атрыманне Дзяржпрэміі Рэспублікі Беларусь маюць права толькі яе грамадзяне.

Ганаровы знак і дыплом лаўрэатам уручаецца ва ўрачыстай абстаноўцы напярэдадні Дня Незалежнасці.

ПЛЁН АД СУМЕСНЫХ ПРАЕКТАЎ

Беларусь зацікаўлена ў паглыбленні інвестыцыйнага супрацоўніцтва са Славакіяй.

Пра гэта заявіў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы са славацкай парламенцкай дэлегацыяй на чале са старшынёй канстытуцыйна-прававога камітэта, кіраўніком групы дружбы Нацыянальнага савета Славакіі з Беларуссю Робертам Мадэем, паведамляе БелТА.

Спікер Савета Рэспублікі звярнуў увагу, што беларуска-славацкі тавараабарот расце, баланс гандлю выкананы. «Мы не абмяжоўваемся толькі ім. У нас развіваюцца інвестыцыйныя праекты. А гэта агульны бізнес, агульныя інтарэсы», — адзначыў Мясніковіч. Кажучы аб інвестыцыйных праектах, ён выказаў пажаданне, каб іх было больш. Бакі, паводле яго слоў, будуць працаваць у гэтым кірунку.

Міхаіл Мясніковіч лічыць, што славацкія кампаніі маглі б больш актыўна прыходзіць у Беларусь. Як член ЕАЭС яна ўяўляе сабой добрую пляцоўку для выхаду на еўразійскі рынак, дадаў кіраўнік верхняй палаты беларускага парламента.

Плённае супрацоўніцтва наладжана паміж пасламі, парламенцкімі групамі дружбы дзвюх краін. Ідзе актыўны абмен візітамі, праводзяцца міжрэгіянальныя форумы і іншыя мерапрыемствы. На думку Міхаіла Мясніковіча, гэта сведчыць пра высокі ўзровень даверу паміж дзвюма краінамі.

Нямала ўжо зроблена для развіцця міжрэгіянальных кантактаў, іх перспектывы спікер ацэньвае як вельмі добрыя. «Мы ўпэўненыя, што нашы адносіны дружбы і супрацоўніцтва будуць і ў далейшым развівацца на карысць народаў», — падкрэсліў старшыня Савета Рэспублікі.

У сваю чаргу Роберт Мадэй пацвердзіў зацікаўленасць славацкага боку ва ўмацаванні стасункаў з Беларуссю. Ён выказаў упэўненасць, што пазітыўныя тэндэнцыі захаваюцца і пасля парламенцкіх выбараў, якія ў Беларусі пройдуць у хуткім часе, а ў Славакіі — у лютым 2020 года.

А ЯК У ІХ?

АБ РАЗВІЦЦІ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ І НЕ ТОЛЬКІ...

ішла гаворка на сустрэчы Міхаіла Мясніковіча з дэлегацыяй заканадаўчага сходу Свярдлоўскай вобласці Расійскай Федэрацыі

У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў сустрэчы, якая адбылася на пачатку тыдня ў Савеце Рэспублікі, знаходзіліся тэмы правядзення рэформы мясцовага самакіравання ў краіне-суседцы і яе выніковасці, развіцця прамысловай кааперацыі на рэгіянальным узроўні, рэалізацыі гандлёва-эканамічных і гуманітарных праектаў.

Акцэнт на максімальнае скарачэнне

У сустрэчы таксама ўдзельнічалі старшыні Пастаянных профільных камісій: Аляксандр ПАПКОЎ (па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні), Сяргей РАХМАНАЎ (па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы) і Віктар СІРЭНКА (па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці). Дэлегацыю з расійскага боку ўзначаліла старшыня Заканадаўчага сходу Свярдлоўскай вобласці Людміла БАБУШКІНА.

У пачатку сустрэчы Міхаіл Мясніковіч пацікавіўся ў расійскага боку, ці захаваўся пасля правядзення рэформы мясцовага самакіравання інстытут дэпутатаў сельскіх і пасялковых Саветаў. «Таму што ў нас таксама ўздымаецца пытанне «патрэбны — ці не патрэбны?», часам нават па мэтазгоднасці, напрыклад, дэпутатаў раённых Саветаў, — растлумачыў ён і дадаў. — Мы лічым, што дэпутацкі корпус базавага і нізавога ўзроўню — рэч патрэбная, і ўласна, людзі сфарміравалі сваё меркаванне аб уладзе, што трэба да кагосьці пайсці, дзесьці абмеркаваць пытанні, а дзесьці, можа, паўплываць на кіраўніка прадпрыемства, выкарыстоўваючы дэпутацкія магчымасці».

Людміла Бабушкіна паведаміла прысутным, што развіццём мясцовага самакіравання ў Расіі шчыльна заняліся згодна са 131-м Федэральным законам яшчэ ў 2003 годзе.

— У 2009 годзе паспрабавалі падвесці вынікі яго рэалізацыі, бо ішлі рознымі шляхамі: у суседніх рэгіёнах — Чэлябінскай і Цюменскай абласцях — дакладна выконвалі нормы адпаведнага закона, стварылі па 400—500 органаў мясцовага самакіравання, муніцыпалітэтаў, — расказала старшыня Заканадаўчага сходу.

Па яе словах, Свярдлоўская вобласць абрала іншы шлях, максімальна скарачаючы колькасць муніцыпальных утварэнняў, якіх у адрозненне ад суседзяў атрымалася 94. Гэта тая аптымальная структура, якая дазваляе кіраваць і эканамічна падтрымліваць тэрыторыю, лічыць яна.

— І сёння ў нас новыя федэральныя законы, якія мы будзем рэалізоўваць, а ў 2024 годзе паглядзім, як лепш трансфармаваць муніцыпальныя раёны, — адзначыла Людміла Бабушкіна.

Дарэчы, цяпер структура складаецца з гарадскіх акруг, муніцыпальных раёнаў, сельскіх і гарадскіх паселішчаў. Яны самастойныя і маюць свае прадстаўнічыя органы.

— Канца рэформаў, напэўна, не бывае: іх можна прыпыніць ці вельмі ўзважана рэалізоўваць, — адзначыла кіраўнік дэлегацыі.

Хто абірае кіраўніка муніцыпалітэта?

Не менш цікавым аказалася пытанне выбарчага працэсу. Заканадаўчы сход Свярдлоўскай вобласці аддае яму шмат увагі. Па словах яго старшыні, было прыкладзена шмат намаганняў, каб сёння да ўлады ў муніцыпалітэтах прыходзілі вопытныя кіраўнікі, а не абраныя на папулісцкіх лозунгах:

— Мы мелі такі вопыт, калі да ўлады прыходзілі абсалютна не падрыхтаваныя да гэтага людзі. Гэты працэс не абмінуў і горад Екацярынбург, — паведаміла Людміла Бабушкіна.

Сёння па рашэнні прадстаўнічых органаў мясцовага самакіравання (дарэчы, згодна з Выбарчым кодэксам усе формы абрання магчымыя) кіраўнікі выканаўчай улады абіраюцца дэпутатамі на конкурсай аснове па прапанове адмысловай камісіі. Гэта ўжо крок наперад, лічыць старшыня Заканадаўчага сходу Свярдлоўшчыны, таму што раней усенароднае галасаванне было справай затратнай і не давала патрэбнага эфекту.

Кааперацыя павінна пашырацца

Не абмінулі ўдзельнікі сустрэчы і абмеркавання эканамічных пытанняў, якія сёння фарміруюць двухбаковы парадак дня.

Трэба сказаць, што рэкорд па тавараабароце паміж Беларуссю і Свярдлоўскай вобласцю ў 600 мільёнаў долараў склаўся ў 2012 годзе і мае ўсё шанцы быць пабіты.

— Тавараабарот у нас складваецца прыблізна на парытэце, у залежнасці ад года ёсць невялікія адхіленні, — адзначыў спікер Савета Рэспублікі. Ён упэўнены, што выключна гандлёвае супрацоўніцтва — гэта добра, але ўяўляе сабой не надта ўстойлівую форму эканамічных адносін. На яго думку, праекты інвестыцыйнага супрацоўніцтва, стварэння сумесных кампаній, асабліва ў прамысловай галіне, не дастаткова актыўна рэалізуюцца.

У якасці прыкладу Міхаіл Мясніковіч прывёў праект па зборцы рухавіку для БелАЗа: Беларусь разлічвае на яго актывізацыю. Ёсць планы рэалізаваць яго сумесна з кампаніяй «Сінара — Транспартныя машыны» ў Свярдлоўскай вобласці. Гаворка ідзе аб рухавіку вялікай магутнасці, які працуе на газавым паліве. Першапачатковыя дакументы ўжо падпісаныя, і наша краіна разлічвае на актывізацыю гэтага праекта, які мог бы стаць доўгатэрміновай і надзейнай праграмай у развіцці двухбаковых адносін, лічыць Міхаіл Мясніковіч.

> Мы лічым, што дэпутацкі корпус базавага і нізавога ўзроўню — рэч патрэбная.

Спікер Савета Рэспублікі прапанаваў сканцэнтраваць увагу на двух-трох сур'ёзных эканамічных праектах, якія датычацца інвестыцыйнай дзейнасці, напрыклад, у сферы машынабудавання, што, безумоўна, паўплывае на ўмацаванне кірунку прамысловай кааперацыі.

На сустрэчы таксама абмяркоўваліся пытанні навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва. Бакі пагадзіліся, што ўдзел у рэалізацыі сумесных праектаў мае асаблівае значэнне для моладзі дзвюх краін. Міхаіл Мясніковіч прапанаваў звярнуць увагу на магчымасць рэалізацыі сумесных праектаў у межах узаемадзеяння рэгіёнаў, напрыклад, Мінскай і Свярдлоўскай абласцей, якія маюць адпаведныя пагадненні аб супрацоўніцтве.

Вольга АНУФРЫЕВА.

НА ШЛЯХУ ДА ЎСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ

23-е МЕСЦА Ў РЭЙТЫНГУ СА 162 ДЗЯРЖАЎ

Беларусь з'яўляецца лідарам у рэгіёне па арганізацыі работы па дасягненні Мэт устойлівага развіцця

ПРА гэта заявіла журналістам намеснік старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па дасягненні МУР Мар'яна ШЧОТКІНА. Яна ўзяла ўдзел у Нацыянальных кансультацыях наконт прыярытэтаў Рамачнай праграмы супрацоўніцтва ААН і Беларусі ў сферы ўстойлівага развіцця на 2021—2025 гады. Мерапрыемства праходзіць з 23 да 25 кастрычніка ў Мінску.

«Паводле ацэнкі сусветных экспертаў, Беларусь з'яўляецца лідарам у рэгіёне па арганізацыі работы па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. Паводле Індэкса ўстойлівага развіцця краін, мы займаем 23-е месца ў рэйтынгу сярод 162 дзяржаў. Гэта вельмі высокая пазіцыя, — адзначыла Мар'яна Шчоткіна. — Таму для нас вельмі важна, каб былі спалучаныя краінавая праграма і нашы нацыянальныя дакументы. Сёння мы зробім акцэнт у тым ліку на рэалізацыі краінавай праграмы, якая разлічана да 2020 года. Там ёсць чатыры асноўныя кірункі — дзяржкіраванне, эканоміка, экалогія і развіццё чалавечага патэнцыялу, што з'яўляецца прыярытэтамі развіцця нашай дзяржавы».

Двухдзённыя кансультацыі дазволяць абмеркаваць прапановы, якія лягуць у аснову краінавай праграмы да 2025 года. «Дарэчы, Беларусь увахо-дзіць у 30 дзяржаў свету, якія ўжо распачалі такое абмеркаванне. Мы хочам прапанаваць, каб пры дасягненні Мэт устойлівага развіцця, пры фарміраванні наступнай краінавай праграмы яе змястоўная частка грунтавалася перадусім на нацыянальных інтарэсах Беларусі. А для гэтага важна, каб былі скарэляваны інтарэсы дзяржкіравання, грамадзянскай супольнасці і прыватнага бізнесу», — адзначыла Мар'яна Шчоткіна.

Нацыянальныя кансультацыі наконт прыярытэтаў Рамачнай праграмы супрацоўніцтва ААН і Беларусі ў сферы ўстойлівага развіцця на 2021—2025 гады ўпершыню праводзяцца з шырокім удзелам партнёраў ААН, такіх як прадстаўнікі ўрада, парламента, арганізацый грамадзянскай супольнасці і бізнесу. Кансультацыі з'яўляюцца працягам дзейнасці арганізацыйнай сістэмы ААН у Беларусі па аказанні дапамогі ў рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця.

Паводле БелТА.

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ?

Новыя стандарты ў адзінстве вымярэнняў

Праект новай рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь «Аб забеспячэнні адзінства вымярэнняў» будзе прадстаўлены на чарговай сесіі Савета Рэспублікі. Напярэдадні разгляду навацый верхняй палатай парламента асноўныя палажэнні абмяркоўваліся на нарадзе пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра ПАПКОВА.



У нарадзе таксама ўзялі ўдзел старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Палаты прадстаўнікоў Андрэй Рыбак, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Дзмітрый Барташэвіч, прадстаўнікі Дзяржкамітэта па стандартызацыі, РУП «Беларускі дзяржаўны інстытут метралогіі», сакратарыята Савета Рэспублікі.

Неабходнасць унясення паправак у дзеючае заканадаўства прадыктаваная ў першую чаргу правядзеннем узгодненай палітыкі ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза і выкананнем агульных патрабаванняў у метралогіі, устаноўленых для ўсіх дзяржаў — удзельніц ЕАЭС.

— Прымаючы гэты праект закона, з аднаго боку, мы ўдасканальваем наша заканадаўства з улікам практыкі прымянення і выконваем нашы абавязацельствы па Дагаворы аб Еўразійскім эканамічным саюзе, падпісаным у Астане ў 2014 годзе. З другога, гарантуем абарону правоў і інтарэсаў нашых грамадзян і юрыдычных асоб, — адзначыў Аляксандр Папкоў, аналізуючы прадстаўленую спецыялістамі Дзяржстандарту абноўленую рэдакцыю законапраекта.

Дзеянне Закона «Аб забеспячэнні адзінства вымярэнняў» накіравана ў першую чаргу на забеспячэнне бяспекі прадукцыі, што выпускаецца на рынак, абарону грамадзян ад неда-кладных вынікаў вымярэнняў, якія выкарыстоўваюцца ў розных сферах грамадскага жыцця — ахове здароўя, ахове навакольнага асяроддзя, у гандлі, у разліках за спажытыя газ, ваду, электраэнергію ці за аб'ём аказаных паслуг. Для гэтага ствараюцца абавязковыя патрабаванні ў выглядзе тэхнічных рэгламентаў.

Новая рэдакцыя закона прадугледжвае ўзаемнае прызнанне работ па забеспячэнні адзінства вымярэнняў у адпаведнасці як з правам ЕАЭС, так і з іншымі міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Таксама замацоўваецца норма аб неабходнасці фарміравання метралагічных службаў дзяржаўных органаў або ў структуры падпарадкаваных арганізацый па каардынацыі дзейнасці па забеспячэнні адзінства вымярэнняў.

Для падтрымкі гэтага працэсу законапраектам у якасці інструмента прадугледжаны новы від дзейнасці — метралагічны аўдыт, які ў выглядзе добраахвотнай працэдуры могуць выкарыстоўваць прадпрыемствы і арганізацыі ў мэтах удасканалення метралагічнага забеспячэння сваёй дзейнасці.

Увядзенне працэдуры метралагічнага аўдыту дазволіць выкарыстоўваць у гэтай рабоце найбольш кваліфікаваных спецыялістаў метралогіі непасрэдна ў вытворчай сферы.

У новай рэдакцыі закона прапануюцца размежаванне дзейнасці дзяржаўнай метралагічнай службы і дзейнасці іншых юрыдычных асоб па правядзенні метралагічнага кантролю сродкаў вымярэнняў у сферы заканадаўчай метралогіі, удакладненне паўнамоцтваў Савета Міністраў, Дзяржстандарту, іншых дзяржаўных органаў, устанаўленне палажэнняў аб Нацыянальным метралагічным інстытуце, змяненне структуры метралагічнага кантролю.

Усяго ў праекце закона прадстаўлена 11 абноўленых элементаў.

Прапанаваны законапраект рэкамендаваны да прыняцця Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у другім чытанні.

Новая рэдакцыя закона «Аб забеспячэнні адзінства вымярэнняў» стане ўжо трэцяй у гісторыі незалежнай Беларусі. Раней карэкціроўкі ў галіне метралагічнага заканадаўства дэпутаты прымалі ў 1995 і 2006 гадах.

Наталля БІТЭЛЬ.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

ТЭХНАЛОГІІ ФАРМІРУЮЦЬ БУДУЧЫНЮ

Ці здольныя звычайныя гандлёвыя зносіны забяспечыць патрэбу ў далейшым развіцці беларуска-японскага супрацоўніцтва?

У Савеце Рэспублікі прайшла сустрэча старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргея РАХМАНАВА з кіраўнікамі японскіх кампаній.

Традыцыйна тавараабарот паміж Беларуссю і Японіяй вымяраецца некалькімі сотнямі мільёнаў долараў — гэта няшмат, улічваючы магчымасці абедзвюх краін. Так адбываецца перш за ўсё з-за таго, што Японія не з'яўляецца прэміяльным рынкам для нашай прадукцыі (фактар адлегласці ніхто не скідвае з рахункаў, ды і высокую канкурэнцыю таксама). Таму гэтую краіну неабходна ўспрымаць як крыніцу тэхналогій. І прыклады пераймання высокіх тэхналогій ужо з'яўляюцца. Як паведаміў Сяргей Рахманаў, пачалася рэалізацыя дастаткова цікавага інвестыцыйнага праекта з удзелам японскай карпарацыі на Беларускім металургічным заводзе, які датычыцца нарэзкі труб:

— У гэтым выпадку інвестыцыі невялікія, але калі будзе створана вытворчасць у Беларусі, мы зможам прадаваць канчатковы, а не прамежкавы прадукт з высокай дабаўленай вартасцю, — лічыць сенатар.

Перайманне тэхналогій і, адпаведна, павелічэнне канкурэнтаздольнасці вырабляемай прадукцыі паўплывае, між іншым, і на рост экспарту ў трэція краіны. Так і трэба дзейнічаць, пераходзячы ад звычайнага гандлю да прамысловай кааперацыі і рэалізацыі сумесных праектаў. І гэта дасць свой станоўчы эфект.

Дарэчы, беларускаму боку таксама ёсць што прапанаваць японскаму бізнесу: напрыклад, праекты ў сферы IT, штучнага інтэлекту, вялікіх баз даных, а таксама іншых тэхналогій, якімі мы валодаем.

Акрамя таго, Японія праяўляе цікавасць да напрацовак у сферы сельгасвытворчасці: гэтая краіна толькі на 40 % забяспечвае сябе прадуктамі харчавання, астатняе прыпадае на долю імпарту. Беларускі бок гатовы падзяліцца сваімі дасягненнямі, напрыклад, зараз разглядаецца варыянт перадачы тэхналогій на ўзаемавыгадных умовах па вырошчванні высакаросłых буякоў.

Генеральны дырэктар японска-беларускай Асацыяцыі па развіцці гандлёвага і прамысловага супрацоўніцтва Міцусіта Чыкахіта пацвердзіў зацікаўленасць сваіх калег у рэалізацыі сумесных праектаў і далейшым развіцці ўзаемавыгадных адносін.

— Адзін з праектаў, які мы б хацелі прапанаваць у Беларусі, датычыцца дамоў састарэлых (такіх зараз у Японіі шмат) — гэта сэрвіс, які аб'ядноўвае сацыяльныя паслугі разам з абслугоўваннем у гэтых дамах, — паведаміў ён.

На думку Сяргея Рахманава, самае галоўнае — добрая дынаміка двухбаковых адносін, вынікам якіх стала павышэнне статусу пасольства Японіі ў Беларусі і прызначэнне Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла ў нашу краіну. Добры знак для далейшага ўмацавання сувязяў.

Вольга АНУФРЫЕВА.

УЛАСНЫ ПОГЛЯД

Пазбегнуць прававых тупікоў

Якім бачыць дэпутацкі корпус выканаўчая ўлада?

На думку старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Краўцова, дэпутаты павінны прымаць такія законы, якія не супярэчылі б развіццю грамадства, не заводзілі ў прававы тупік. А такіх нестыковак апошнім часам узнікае нямала. Аб гэтым, у прыватнасці, ішла размова падчас нядаўняй прэс-канферэнцыі для прадстаўнікоў СМІ ў Мастах.

Фота БелТА.

У першую чаргу кіраўнік рэгіёна адзначыў высокую актыўнасць жыхароў Гродзеншчыны падчас вылучэння кандыдатаў у ніжнюю палату парламента. Сапраўды, сёлета на 13 дэпутацкіх месцаў ад рэгіёна прэтэндуюць 66 чалавек. Гэта на 11 чалавек больш, чым у папярэднюю выбарчую кампанію. У сярэднім — 5 чалавек на месца.

— Гэта высокая канкурэнцыя, і ёсць з каго выбраць, — адзначыў Уладзімір Краўцоў. — Калі раней было па адным чалавеку на акругу, цяпер такога няма. Сярод кандыдатаў ёсць кіраўнікі, юрысты, беспрацоўныя, пенсіянеры. Хацелася б, каб у парламент трапілі людзі, якія маюць рознабаковыя здольнасці, добра разбіраюцца ў эканоміцы, юрыспрудэнцыі. А галоўнае — выконваюць тыя задачы, якіх чакае выканаўчая ўлада.

За час існавання незалежнай дзяржавы створана трывалая заканадаўчая база, якая распрацавана літаральна з нуля. Але жыццё не стаіць на месцы. І некаторыя законы пачынаюць супярэчыць з рэчаіснасцю, атрымліваюць развіццё эканомікі. Каб пазбегнуць такіх нестыковак, неабходна ўдасканальваць заканадаўства. Такія спадзяванні выканаўчая ўлада ўскладае, у тым ліку, на будучы дэпутацкі корпус наступнага склікання.

— Канешне, выканаўчай уладзе неабыякава, хто прадставіць наш рэгіён у парламенце, — падкрэсліў Уладзімір Краўцоў. — Хоць, здаецца, паехалі ў Мінск і там працуюць. Я таксама быў дэпутатам ніжняй палаты, і з майго пункту гледжання, у дэпутата два сур'ёзныя кірункі ў рабоце. Гэта непасрэдна работа над заканадаўствам, у камісіях, зносіны з міністэрствамі і ведамствамі. І другі кірунак — гэта работа ў сваёй акрузе. Павінна быць прамая сувязь з выбаршчыкамі, з насельніцтвам, каб зразумець, як рэалізуюцца тыя ці іншыя законы, як іх удасканаліць, што змяніць.

> Кажуць, што ў палітыцы няма месца сумленню, шчырасці, адкрытасці, але гэта не так. Людзі аддаюць перавагу менавіта тым, хто неабыякавы і паслядоўны, умее трымаць сваё слова.

Не апошнюю ролю адыгрывае і асоба дэпутата. Што датычыць кандыдатаў, якія вылучаны ад Гродзеншчыны, палова з іх — прадстаўнікі партый. Ёсць кандыдаты ад ЛДП, «Грамады», КПБ, «Зялёных», БНФ, АГП і іншых. Нямала тых, каго вылучылі працоўныя калектывы. Прафесійны склад таксама даволі шырокі — ад вартаўніка да дырэктара прадпрыемства. Ёсць і беспрацоўныя. Шырока прадстаўлена бізнес-кола. Жаночае прадстаўніцтва не сказаць, што значнае. З 66 кандыдатаў іх усяго 15. Маладых людзей таксама няшмат — пяць чалавек. Хто з іх трапіць у парламент — пакажуць выбары, якія адбудуцца 17 лістапада. Ад Гродзеншчыны будзе абрана 13 дэпутатаў — па колькасці акруг.

Зарэгістравана і трое дзеючых членаў парламента, якія выказалі намер працягваць дэпутацкую работу і прайшлі неабходныя працэдуры пры вылучэнні ў кандыдаты 7-га склікання. Дарэчы, не ўсе прэтэндэнты на месца ў парламенце змаглі дайсці да працэсу рэгістрацыі, пасля якога яны могуць прэтэндаваць на галасы выбаршчыкаў. «Адсеялася» 11 чалавек, з якіх пяць самі знялі свае кандыдатуры, а яшчэ шасці адмоўлена ў рэгістрацыі з-за недасканаласці дэкларацыі альбо недакладных подпісаў.

— Кажуць, што ў палітыцы няма месца сумленню, шчырасці, адкрытасці, але гэта не так. Людзі аддаюць перавагу менавіта тым, хто неабыякавы і паслядоўны, умее трымаць сваё слова, — адзначыў кіраўнік рэгіёна. — Зразумела, што зараз, напярэдадні выбараў, кандыдаты павінны пабываць у калектывах, сустрэцца з людзьмі. Даведацца, што іх хвалюе. Тут розныя пытанні ўзнікаюць — дарогі, праблемы ЖКГ, зямельныя пытанні, заработная плата, новыя рабочыя месцы — у праблемах выбаршчыкаў няма дробязяў.

Па словах Уладзіміра Краўцова, дэпутаты працуюць разам з мясцовымі ўладамі, каб зняць праблемы, зрабіць жыццё жыхароў больш камфортным і бяспечным. Ад дэпутатаў залежыць і выкананне тых задач, якія былі прыняты на Усебеларускім народным сходзе.

— Пачнецца новая пяцігодка, і будуць распрацоўвацца новыя кірункі дзейнасці, важна, каб дэпутаты працавалі на перспектыву. Што датычыцца нашых кантактаў, выканкам заўсёды запрашае народных абраннікаў на пасяджэнні, мерапрыемствы, міжнародныя сустрэчы, — паведаміў кіраўнік рэгіёна.

На думку кіраўніка абласной вертыкалі ўлады, дэпутатам варта быць больш публічнымі і даступнымі для прадстаўнікоў СМІ. Выказвацца па ўсіх пытаннях, якія хвалююць наша грамадства, расказваць, над чым яны працуюць.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

КАМАНДНЫ

Дэпутат ніжняй палаты парламента Пётр САЛАЎЁЎ

ГРАМАДСКАЯ прыёмная дэпутата парламента ад Магілёўскай прамысловай выбарчай акругі № 87 Пятра Салаўёва рэдка бывае зачынена. Сюды можна звярнуцца са сваёй скаргай або прапановай практычна ў любы дзень. Увесь сакрэт у тым, што на яе базе працуе яшчэ і філіял абласной грамадскай арганізацыі «Белая Русь». А на прыёмах грамадзян часта прысутнічаюць і дэпутаты мясцовага ўзроўню. Сумешчаная прыёмная працуе другі год, і жыхары Задняпроўя апошнім часам сталі звяртацца сюды нават часцей, чым у некаторыя іншыя інстанцыі. Кажуць, што ёсць прыклады, калі толькі тут дапамагалі вырашыць самыя што ні ёсць доўгатэрміновыя пытанні. Карэспандэнт «МС» заглянула сюды, каб даведацца пра ўсё з першых вуснаў.

Адзін у полі не воін

Графік работы дэпутата парламента вядомы: тыдзень у сваёй акрузе і тры непасрэдна ў парламенце. Ведаю, што Пётр Салаўёў яшчэ ў дарозе на Магілёў, але яго прыёмная ўжо адкрыта. Мяне прымае яго памочнік Вольга Сінякіна і, каб не марнаваць час, уводзіць, як той казаў, у сутнасць справы.

— Вось так, тандэмам з грамадскай арганізацыяй і тутэйшымі дэпутатамі, мы пачалі працаваць пасля выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў у лютым 2018 года, — тлумачыць яна. — Прыйшлі маладыя энергічныя людзі, якія гатовы былі змяніць нешта да лепшага. З імі дэпутат Салаўёў і паспрабаваў наладзіць кантакт, аб'яднаць усіх, хто працуе ў межах нашай акругі № 87. Па-першае, для таго, каб перадаць свой вопыт і навучыць чамусьці. Па-другое, каб падключыць мясцовых дэпутатаў да актыўнай грамадскай дзейнасці. У нашай камандзе сёння каля дзесяці энергічных народных абраннікаў.

Для большай эфектыўнасці работы з насельніцтвам вырашана было кансалідавацца вакол грамадскай арганізацыі «Белая Русь». Яе пярвічкі ёсць амаль ва ўсіх установах і прадпрыемствах. Мы выйшлі з прапановай на абласную арганізацыю, і там нас падтрымалі. У выніку прыёмная дэпутата працуе на пастаяннай аснове, а не адзін-два дні ў месяц. Людзям такая форма работы падабаецца, дагэтуль яе на мясцовым узроўні ніхто не практыкаваў. За перыяд нашай дзейнасці было разгледжана звыш 500 зваротаў, з іх 37 калектыўных. На прыёме пабывала больш за 800 чалавек. Не ўсе пытанні можна вырашыць, асабліва тыя, якія датычацца судоў, уласнасці, але ж мы тлумачым чалавеку, што і як.

Ёсць шмат прыкладаў, калі менавіта дэпутаты даводзілі да лагічнага завяршэння тыя пытанні, якія гадамі не вырашаліся. Вось толькі некаторыя з іх. На вуліцы Астроўскага ў дварах не працавала ліўнёўка, яе першапачаткова паклалі няўдала, і людзі гадамі пакутавалі. Са сваёй праблемай яны прыйшлі ў грамадскую прыёмную. Да справы падключыўся абласны дэпутат Іван Вараб'ёў, сумесным намаганнямі ліўнёўку аднавілі.

Ёсць у Магілёве мікрараён з экзатычнай назвай Абісінія, дзе наогул існаваў цэлы букет цяжкасцяў. У тым ліку і «доўгайграючых».

— Жыхары мікрараёна прыйшлі да нас на прыём з вялікім стосам дакументаў, — расказвае памочнік дэпутата. — Прычым пытанні былі з разраду такіх, якія прасцей праігнараваць, чым пачаць імі займацца. І дзесьці даводзілася браць ініцыятыву ў свае рукі, каб зламаць стэрэатыпы. Недзе паўгода займаліся выключна гэтым мікрараёнам. Там наогул шмат людзей актыўных. Тэлефанавалі нам па любым выпадку. То святла няма, то дарогу не пачысцілі. Прасілі прабачэння за тое, што не зусім па адрасе звяртаюцца, і тлумачылі гэта тым, што з намі прасцей праблемы вырашаць.

Справа майстра баіцца

Добрых спраў зроблена шмат, але асноўнымі ў гэтым спісе Пётр Салаўёў і яго каманда лічаць дзве. Гэта дапамога дзіцячаму сацыяльнаму прытулку на вуліцы Мельнікава і аддзяленню дзённага знаходжання інвалідаў Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна. Але пра ўсё па парадку. Пачалося з таго, што некалькі гадоў таму Пётр Салаўёў завітаў у дзіцячы сацыяльны прытулак на навагоднія святы. Тое, што ён там убачыў, выклікала жаданне дзейнічаць як мага хутчэй. Уявіце сабе будынак 1968 года са старымі памяшканнямі, што ніколі не ведалі рамонту. Па ініцыятыве дэпутата быў створаны апякунскі савет, і работа пайшла. Спачатку адрамантавалі сталоўку, замянілі вокны, дзверы. Потым узяліся за харчблок, там абнавілі ўсю электраправодку, паклалі новую плітку. Затым памянялі санвузлы. У справу былі ўцягнуты шматлікія арганізацыі і прадпрымальнікі. Практычна на ўсіх сустрэчах з працоўнымі калектывамі Пётр Аляксандравіч казаў пра гэты прытулак, і шмат хто дапамагаў. Летась на 1 верасня туды было цэлае паломніцтва. З гэтым прытулкам і цяпер сувязь не перарываецца. Нядаўна вось дапамагалі з пашывам пакрывалаў, вывазам лістоты, мянялі святільні.

Па падобнай схеме рамантаваліся памяшканні для аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў.

— Падключалі спецыялістаў розных прадпрыемстваў і арганізацый, — расказвае Пётр Салаўёў. — Быў зроблены праект на электрычнасць, заменены вокны, адрамантаваны памяшканні. Вельмі дапамаглі спецыялісты «Магілёўхімвалакна», якім кіруе Пётр Руднік, «Магілёўэнерга», на чале якога знаходзіцца наш сенатар Канстанцін Пуціла. Рамонт рабілі паступова, адразу ўсё ахапіць было немагчыма. Зладзілі нармальнае безбар'ернае асяроддзе, адрамантавалі калідор. Апошняе, над чым працавалі, — камп'ютарны клас. Застаўся адзін пакой, на які трэба будзе зрабіць праект і потым яго рэалізаваць, — гэта будучая швейная майстэрня. Праект каштуе 11 тысяч рублёў, але спадзяёмся на спонсарскую дапамогу. Наогул у рамонт не было ўкладзена ніводнай бюджэтнай капейкі.

Дэпутатамі не нараджаюцца...

— Існуе думка, што ад дэпутата мала толку, — правакую суразмоўцу.

— Не згодны, — кажа Пётр Салаўёў. — Але дэпутатамі адразу не становяцца. Прывяду свой асабісты прыклад. Першыя паўгода ты ўнікаеш у работу і выбудоўваеш сваю сістэму. Над табой няма начальнікаў, ты сам

ПЛЁННЫ

Штомесяц дэпутаты Гомельскага абласнога Савета выязджаюць у той ці іншы раён, каб на месцы пазнаёміцца з унікальным вопытам, уласцівым канкрэтнай тэрыторыі.

Сёлета яны ўжо пабывалі ў Брагінскім, Рэчыцкім, Буда-Кашалёўскім, Акцябрскім, Веткаўскім, Лоеўскім, Рагачоўскім, Лельчыцкім і Нараўлянскім раёнах. Запланавана наведаць яшчэ Гомельскі і Чачэрскі. У гэтых семінарах бяруць удзел і прадстаўнікі органаў кіравання, прадпрыемстваў і арганізацый, якія адначасова з'яўляюцца дэпутатамі Саветаў рознага ўзроўню.

Праграма звычайна запланавана ў інтэнсіўным тэмпе: трэба наведаць некалькі сельсаветаў і ў кожным — не адзін населены пункт. Праходзяць размовы з насельніцтвам, сустрэчы ў працоўных калектывах, абавязкова ўдзяляецца ўвага розным аб'ектам сацкультбыту.

На тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна, напрыклад, вывучаўся досвед аднаўлення, захавання і развіцця традыцыйных культур і рамёстваў. Пацярпелы ад чарнобыльскай катастрофы Брагінскі раён падзяліўся сваімі ўнікальнымі мясцовымі ініцыятывамі, якія рэалізуюцца ва ўзаемадзеянні з міжнароднымі арганізацыямі. У Гомелі расказалі пра напрацоўкі сістэмнага ўзаемадзеяння органаў мясцовага кіравання і самакіравання з насельніцтвам праз калегіяльны орган тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Захаванню гістарычнай і культурнай спадчыны малой радзімы вучыліся ў Лоеўскім раёне. Дапамозе ў рэалізацыі прадпрымальніцкіх пачынанняў — у Акцябрскім.

Дэпутаты заўсёды звяртаюць увагу на санітарны стан тэрыторый. Навядзенне парадку на зямлі — задача пастаянная. Прыведзены ў парадак месцы масавага адпачынку, помнікі, паркі, скверы, дзіцячыя пляцоўкі, пасаджаны тысячы дрэў. Да кантролю і кансультатыўнай дапамогі прыцягваюцца прадстаўнікі камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, санстанцыі, ЖКГ, земле-

Тэлесеткі

«ТУР ПА БЕЛАРУСІ» НА АНТ

У праграме «Контуры» адкрываецца новая рубрыка «Тур па Беларусі» ад аглядальніка Ігара Тура. Яна будзе знаёміць гледачоў з беларусамі, якія імкнуцца дасягнуць поспеху і гатовыя ўкладаць свае сілы ў тое, каб больш камфортным стала не толькі іх уласнае жыццё, але і тых, хто жыве побач.

Па фармаце нас чакае серыя рэпартажаў пра людзей, якіх вылучае ўменне распараджацца сваімі магчымасцямі — неабавязкова фінансавымі. Пабудавалі дзіцячую пляцоўку, дапамаглі пенсіянеру адрамантаваць дом альбо арганізавалі футбольны турнір — значыць, і вы можаце стаць героем новай рубрыкі.

— Павялічыць маштабы добрых спраў — наша галоўная задача, да чаго будзе імкнуцца ў выніку ўся каманда. Але для пачатку мы хацелі б расказаць пра людзей, якія робяць нешта ў жыцці не толькі для сябе і бескарысліва. Паказаць, што чалавекам, які будзе ганарыцца сам сабой і якім будуць ганарыцца ўсе, можа стаць кожны, галоўнае — мець жаданне! Магчыма, недзе мы хочам змяніць стаўленне да такіх людзей, бо часам ім даводзіцца чуць нешта кшталту: «Табе, што, больш за іншых трэба?» Ды і мясцовыя ўлады, спадзяюся, звернуць на такіх герояў увагу, бо часам людзям для рэалізацыі добрай справы патрэбна дапамога ці хоць бы адсутнасць перашкод. Мяне асабіста матывуе ў гэтай рабоце таксама абвостранае пачуццё справядлівасці. Бо, на маю думку, абсалютна справядліва дапамагаць больш і падтрымліваць тых, хто ўкладае свае сілы на карысць грамадства, а не толькі патрабуе нечага для сябе, — дзеліцца аўтар і вядучы рубрыкі, палітычны аглядальнік АНТ Ігар ТУР. — На этапе прома-кампаніі ў патоку зваротнай сувязі можна выдзеліць два кірункі. Першы — відэапаведамленні людзей, у якіх яны апавядаюць пра сябе альбо пра знаёмых, хто зрабіў нешта для іншых, бо мог. Гісторыі розныя — пра аднаўленне помнікаў, пра дабрачынны мотапарад альбо, напрыклад, гісторыя ад жанчыны, якая дапамагла знайсці сябе ў жыцці абсалютна незнаёмаму чалавеку з інваліднасцю. У дзень прыходзіць 5-7 паведамленняў. Другая частка паступае ад калег-рэпарцёраў. Журналісты часта пра такіх людзей ведаюць, пішуць, аднак да «Тура па Беларусі» не было такой прасторы, дзе можна было б расказаць пра іх. У мяне ў асабістых паведамленнях ужо каля паўсотні такіх гісторый.

У эфіры, па планах каманды, рубрыка з'явіцца ў першую нядзелю лістапада, але кім будуць героі дэбютных рэпартажаў, пакуль сакрэт. Выходзіць «Тур па Беларусі» будзе раз на два тыдні ў «Контурах», аднак калі колькасць гісторый будзе вялікая, то перыядычнасць можа змяніцца. Таму спяшайцеся і дасылайце свае відэа на электронную пошту праекта tur@ont.by альбо ў сацыяльных сетках. Ніводная з іх не застанецца без вывучэння і зваротнай сувязі.

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 99

У пачатку кастрычніка адбыліся чэмпіянаты Беларусі (1-я ліга) па шашках-100 сярод мужчын і жанчын. Права выступаць налета ў вышэйшых лігах заваявалі па чатыры чалавекі з кожнага турніру. У мужчын павышэнне ў класе атрымалі майстры Захар Шыбакоў (Мар'іна Горка), Дзмітрый Немец, Іван Трубнікаў (абодва Мінск), Сяргей Садоўскі (Гродна). У жанчын вышэйшую лігу папоўнілі Дар'я Нікіфарава, Паліна Казлова, Ганна Вузлік, Марыя Часнакова (усе Мінск).

Для самастойнага рашэння прапануем кампазіцыі, складзеныя вядучым аддзела.

№ 70



Белыя простыя шашкі: e1, d2, g3, d4, h4, e5, d6, h6 (8)
Чорныя простыя шашкі: b2, f2, c3, b4, f4, b6, f8 (7)

№ 71
Белыя простыя шашкі: e3, f4, a5, e5, d6, h6 (6)
Чорныя простыя шашкі: b2, c3, b4, b6, c7, b8 (6)

№ 72
Белыя простыя шашкі: c5, d6, c7, Белыя дамкі: a5 (4)
Чорныя простыя шашкі: b2, h4, g5, g7, b8, f8 (6)

№ 73
Белыя простыя шашкі: 16, 18, 27, 28, 32, 37, 42, 47 (8)
Чорныя простыя шашкі: 6, 8, 10, 21, 29, 36, 39 (7)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Анонс: 26—27 кастрычніка 2019 года ў сталічнай СДЮШАР па шахматах і шашках (вул. Ракаўская, 24) адбудзецца традыцыйны турнір па шашках-64 памяці шматразовага чэмпіёна БССР Г. Хацкевіча. Пачатак у 14.00. Галоўны суддзя — Андрэй Станіслававіч Валюк (8-029 5621190 — МТС).

Праверце свае рашэнні: выпуск № 98 ад 11.10.2019.

№ 65 1.33-29? 19-24! 2. 28x26 24x22x

№ 67 1.c7-d8 h6xf4 2.f6-e7 f8xb4 3.b2-a3 e3xc5 4.g1xg5 h4xf6 5.d8xb6 a5xc7 6.a3xc5

№ 68 1.c7-b8 f2xh4 2.a5xc7 d8xb6 3.d2-e3 f4xb4 4.b8xg3 h4xf2 5.e1xg3 h2xf4 6.b2-c3 b4xd2 7.c1xe7 f8xd6 8.h6xa7+

Самае важнае дасягненне пры гэтым — насельніцтва стала актыўна браць удзел у грамадскім жыцці свайго рэгіёна. Прычым не толькі ў добраўпарадкаванні, самафінансаванні, але і ў спартыўным, і ў культурным жыцці.

Формаў стасункаў з людзьмі шмат. Кіраўнікі сельсаветаў праводзяць сходы па месцы жыхарства, сустрэчы ў працоўных калектывах, выязныя сумесныя прыёмы грамадзян, шчыльна працуюць са зваротамі людзей. Дарэчы, апошняе — адна з самых важных формаў дзейнасці, лічыць **старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ:**

— Непасрэдна ў абласны Савет сёлета паступіла 40 асабістых зваротаў і 109 — на прамую тэлефонную лінію. Самая вялікая колькасць пытанняў датычыцца жыллёва-камунальнай гаспадаркі, працаўладкавання, гандлёвага і бытавога абслугоўвання, падтрымкі асабістых дапаможных гаспадарак, добраўпарадкавання... Усе пытанні да поўнага іх вырашэння застаюцца на кантролі. Сталыя людзі звяртаюцца з просьбай штосьці адрамантаваць, забяспечыць бясплатным сацыяльным абслугоўваннем. Задача дэпутата — даходліва растлумачыць, чым дзяржава можа дапамагчы, вырашэнне якіх пытанняў можа пачакаць, а што павінен рабіць сам грамадзянін.

Дарэчы, Гомельскім абласным Саветам дэпутатаў прынята 16 рэгіянальных комплексаў мерапрыемстваў па рэалізацыі дзяржаўных праграм: «Малое і сярэдняе прадпрымальніцтва», «Сацыяльная абарона і садзейнічанне занятасці», «Адукацыя і маладзёжная палітыка», «Культура Беларусі», «Пераадоленне наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 2011—2015 гады і на перыяд да 2020 года», «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў», «Развіццё аграрнага бізнесу» ды іншыя.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

РЭАЛЬНЫЯ СПРАВЫ

Чалавек, якому больш за ўсіх трэба

Дэпутат райсавета арганізоўвае танцавальны гурток, адкрывае профільны клас, уладкоўвае прыпыначны павільён

ДЭПУТАТ Брэсцкага раённага Савета па Мухавецкай выбарчай акрузе Ірына ПРАКАПОВІЧ працуе начальнікам аддзялення па грамадзянстве і міграцыі Брэсцкага РАУС. Дэпутатам яна стала толькі ў гэтым скліканні, але ў акрузе добра ведаюць свайго выбранніка. Ірына Віктараўна там ужо свой чалавек.

Мухавец — немалы прыгарадны пасёлак, яго насельніцтва разам з навакольнымі вёскамі складае больш за чатыры тысячы чалавек. Нямала былых гараджан пражывае ў дачных дамах, дзе цяпер дазволеная часовая рэгістрацыя. Такая вось спецыфіка акругі, з якой Ірына Пракаповіч пачала знаёміцца яшчэ падчас перадвыбарнай кампаніі. А ў якасці дэпутата яна наведвае ўсе пасяджэнні камісій пры выканкаме, сельскія сходы, святочныя і іншыя мерапрыемствы, ды і проста гутарыць з людзьмі. Пасля адной з такіх гутарак з жаночай грамадскасцю нарадзілася ідэя адкрыць гурток па танцах.

Напярэдадні дэпутат як супрацоўнік органаў унутраных спраў прааналізавала сітуацыю з падлеткавымі правапарушэннямі, сваімі думкамі падзялілася на адным з сельскіх сходаў. Разам сталі раіцца, як найбольш захапіць падлеткаў карыснымі заняткамі. Мама аднаго школьніка сказала, што добра было б мець харэаграфічны гурток або студыю танцаў. Яе падтрымалі іншыя бацькі — пры наведванні такога гуртка дзіця атрымлівае і фізічнае, і эстэтычнае выхаванне. Так і вырашылі. Патрэбнае памяшканне аказалася ў Доме культуры.

Дэпутат знайшла ў абласным цэнтры выкладчыка танцаў. Ён ездзіць у Мухавец з горада тры разы на тыдзень і праводзіць заняткі. Ужо 90 дзяцей і падлеткаў наведваюць гэтыя ўрокі. Нават на рэспубліканскім конкурсе сёлета паказалі вельмі добрыя вынікі. І гэта ўсяго за год!

— Галоўнае, што ім цікава, яны чакаюць гэтых заняткаў, — кажа Ірына Віктараўна. — Аднойчы давялося прысутнічаць на справаздачным канцэрце па выніках вучэбнага года. Назірала, як дзеці з задавальненнем пераадзяваюцца ў касцюмы, як рэпеціруюць. Відаць, што педагог прыйшоўся ім даспадобы, таму ўсё атрымліваецца. Бацькі надзвычай задаволеныя заняткамі дзяцей.

> Дэпутат — гэта і ёсць чалавек, якому больш за іншых трэба. Калі цябе абралі, калі табе даверылі, то людзі чакаюць нейкіх рэальных спраў. Ды і на сустрэчах не соромна з імі гутарыць, глядзець ім у вочы.

«Разам з бацькамі, настаўнікамі мясцовай школы мы раіліся, як далей развіваць выхаваўчы працэс у нашай вялікай вёсцы, і прыйшлі да высновы, што трэба адкрыць профільны міліцэйскі клас, — працягвае дэпутат. — Сказана — зроблена. З першага верасня вучні пятага класа пайшлі ў профільны клас на конкурснай аснове, бо з трох паралеляў было надта многа ахвотных. Давялося ўлічваць сярэдні бал і іншыя характарыстыкі. Праграма для навучання тут такая ж, як у іншых профільных класах. Але ж стымул вучыцца лепш з'явіўся».

Да таго ж вучням названага класа дэпутат арганізоўвае розныя сустрэчы, экскурсіі. Нядаўна яны наведалі музей абласнога УУС. У раёне гэта першы падобны клас, яго вопыт будуць вывучаць настаўнікі іншых школ.

На рахунак дэпутата Пракаповіч можна запісваць таксама прыпыначны павільён у напрамку Камяніцы Жыравецкай, які нядаўна з'явіўся. У яе акрузе шмат дачных пасёлкаў, і па дарозе да Мухаўца не раз даводзілася назіраць, як у самае рознае надвор'е мерзнуць людзі, асабліва пенсіянеры, у чаканні аўтобуса. Цяпер павільён на былым прыпыначным пункце паставілі. Ёсць заслуга дэпутата ва ўзвядзенні дзіцячай пляцоўкі, тратуарнай дарожкі ў вёсцы.

— Я і раней заўсёды імкнулася дапамагчы людзям, а цяпер для гэтага атрымала дэпутацкія паўнамоцтвы, — разважае Ірына Пракаповіч. — Цяпер стала прасцей размаўляць з любым кіраўніком, калі справа датычыцца той жа пляцоўкі альбо трэба паправіць пешаходную сцежку. Не атрымаецца з першага разу — я не пасаромеюся патурбаваць другі альбо трэці раз, пакуль справа не зрушыцца з месца. Неаднойчы даводзілася чуць, у тым ліку нават ад уласнага мужа: «А што, табе больш за ўсіх трэба?» Але ж, на мой погляд, дэпутат — гэта і ёсць чалавек, якому больш за іншых трэба. Калі цябе абралі, калі табе даверылі, то людзі чакаюць нейкіх рэальных спраў. Ды і на сустрэчах не соромна з імі гутарыць, глядзець ім у вочы.

Дэпутат Пракаповіч не толькі падтрымлівае ініцыятывы ў сваёй акрузе, але і праяўляе актыўнасць у раённым Савеце. Менавіта там вырашылі апекаваць дзяцей са свайго раёна, якія цяпер жывуць у Кобрынскай дзіцячай вёсцы. Жывуць яны ў ёй зразумела па якой прычыне — з-за нядбайнасці бацькоў. Народныя выбраннікі стараюцца трымаць дзяцей у полі зроку: раз на некалькі месяцаў выязджаюць туды, наведваюць іх прыёмныя сем'і. З Брэсцкага раёна ў дзіцячай вёсцы жывуць 12 чалавек у трох сем'ях. Перад навагоднім святам дэпутаты ўзялі з сабой цырульніка, зрабілі прычоскі ўсім дзецям з падшэфных сем'яў. Трэба было бачыць іх радасць!

Звычайна возяць падарункі, рэчы, патрэбныя для навучання і развіцця. Дзеці ўжо ведаюць сваіх дэпутатаў, чакаюць сустрэч з імі. Важна бывае пагаварыць, пацікавіцца справамі, паказаць, што іх памятаюць і чакаюць на малой радзіме, лічыць Ірына Віктараўна.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ФОРУМ

Дома заўсёды лепей

ПАДТРЫМКА ўладай замяшчальных сямей спрыяе эфектыўнаму выхаванню юных грамадзян з нялёгкім лёсам. Безумоўна, як бы ні было добра пад дахам дома сацыяльнага прызначэння, клопат, няхай і не родных, але бацькоў — найлепшы спосаб вырасціць грамадзян, у якіх не будзе асаблівых праблем з інтэграцыяй у дарослым жыцці ў грамадства. Гэтыя думкі былі агучаны на першым абласным форуме замяшчальных сямей, які днямі адбыўся ў Віцебску.

Дзяржава будзе аказваць яшчэ большую падтрымку замяшчальным сем'ям. Абарона правоў і інтарэсаў дзяцей — вельмі сур'ёзная і ў найвышэйшай ступені адказная задача, якая ўвесь час знаходзіцца ў полі зроку мясцовай улады. І паўнавартасная рэабілітацыя, сацыялізацыя і інтэграцыя ў грамадства з'яўляецца адным з найважнейшых кірункаў дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі, падкрэсліў адзін з удзельнікаў форуму **старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ.** Народны выбраннік выказаў упэўненасць, што мерапрыемства стане традыцыйным, і шчыра падзякаваў тым, хто абраў для сябе вельмі няпростую ношу: практычна кругласутачна і без выхадных дзён «працаваць мамамі і татамі».

Адна з мэт форуму — прыцягненне яшчэ большай увагі да тэмы і абмен вопытам з прадстаўнікамі розных зацікаўленых структур.

Паводле інфармацыі галоўнага ўпраўлення па адукацыі Віцебскага аблвыканкама, сёння на сямейных формах выхавання знаходзіцца каля 76 % дзяцей, якія маюць патрэбу ў клопаце з боку дзяржавы. Калі ў 2001-м было ўсяго 45 замяшчальных сямей, дык цяпер — больш за 500.

Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ на форуме замяшчальных бацькоў.

Акрамя таго ў вобласці дзейнічае 31 дзіцячы дом сямейнага тыпу, дзе выхоўваюцца 222 дзіцяці. Расце колькасць усыноўленых дзяцей: у сем'ях усынавіцеляў жывуць 732 хлопчыкі і дзяўчынкі.

Такая практыка спрыяе эканоміі бюджэтных сродкаў на ўтрыманне ўстаноў сацыяльнага прызначэння.

На Віцебшчыне ў дзвюх школах-інтэрнатах і двух дзіцячых дамах выхоўваецца ўсяго каля 330 дзяцей. Для параўнання, у 2007-м было больш за 1560.

На форуме шмат разоў згадвалі Дэкрэт № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у небяспечных сем'ях», які паспрыяў таму, каб у краіне стала больш шчаслівых дзяцей. За гады дзеяння дэкрэта стала прыблізна ўдвая меней тых, каго пазбавілі бацькоўскіх правоў. Калі ў 2007-м такіх грамадзян было 587, дык летась — каля 250.

За час дзеяння дакумента 580 непаўналетніх вярнуліся ў родныя сем'і — на падставе рашэння судоў аб аднаўленні бацькоў у адпаведных правах. Толькі летась і сёлета такім чынам свой статус памянялі 33 бацькі і маці.

Форум быў вельмі карысны і для саміх бацькоў. Ім дадаткова растлумачылі нюансы дзяржаўнага фінансавання, пытанні афармлення працоўных дагавораў, водпускаў і іншыя моманты.

Акрамя таго адбылася коўч-сесія. На ёй далі карысныя парады прадстаўнікі ўпраўленняў аховы здароўя аблвыканкама, ЖКГ, МЧС, МУС, іншых ведамстваў.

Між іншым у суседняй з Віцебскай вобласцю Расіі праяўляюць вялікі інтарэс да беларускага вопыту. І ўжо сталі традыцыйнымі візіты расійскіх калег для яго пераймання.

Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.

ПАЛІКЛІНІКА НАЛЕТА, А МОСТ УЖО ПРАЗ ДВА ТЫДНІ

Планы па забудове Гомеля дэпутаты гарсавета абмеркавалі з выездам на будаўнічыя пляцоўкі

ДЭПУТАТЫ Гомельскага гарсавета зацвердзілі межы Гомеля, у якія ўключаны землі лесагаспадарчых арганізацый. Агульная плошча горада ўжо дасягнула 114,5 тысячы гектараў. Усе чатыры раёны Гомеля — пад пільнай увагай народных выбраннікаў.

Дэпутаты Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў абмяркоўваюць рэалізацыю генеральнага плана і развіццё Гомеля ў Навабеліцкім раёне.

Як расказаў **галоўны архітэктар Гомеля Юрый ЛІТВІНАЎ,** мікрараён Хутар у Навабеліцкім раёне будуецца пераважна для сем'яў, якія патрабуюць паляпшэння жыллёвых умоў. Ім аказваюць дзяржаўную падтрымку, таму будаўніцтва вядзецца хутка. Засталося ўзвесці 16 шматпавярховікаў, і раён будзе цалкам пабудаваны. Будынкі суда, крамы, аўтамыйка дакладна будуць. Што датычыцца школы — пачнецца яе праектаванне. У мікрараёне Паўднёвы вялікая плошча побач з дзіцячым садком № 50 зарэзервавана пад школу на 1400 навучэнцаў і садок на 230 месцаў. Хоць летась тут і быў здадзены ў эксплуатацыю дзіцячы садок на 190 месцаў, але чарга засталася, тым больш што Навабеліцкі ЗАГС рэгіструе па 700—800 малых штогод. Ім праз некалькі гадоў абавязкова спатрэбіцца дашкольная ўстанова — бацькі хацелі б, каб у крокавай даступнасці. Цяпер засталося самае складанае — вызначыць крыніцу фінансавання.

У паўднёвым напрамку, па абодва бакі Чарнігаўскай шашы, на перспектыву запланавана будаўніцтва новых мікрараёнаў Гомеля. Узводзіць іх маюць намер у лясным масіве, што запатрабуе вялікай высечкі дрэў. Схемы забудовы пакуль няма, але прынцыповае рашэнне прынята, і перадпраектныя работы вядуцца. У іх удзельнічаюць навукоўцы Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук. Яны выбіраюць дзялянкі з найменш каштоўнымі пародамі дрэў, якімі можна ахвяраваць. Таксама Навабеліца прырасце мікрараёнам, які размесціцца на ўездзе ў Гомель з боку Расійскай Федэрацыі.

У Савецкім раёне з'явіцца яшчэ 170 тысяч «квадратаў» жылля на Шведскай Горцы: распрацавана дакументацыя на забудову мікрараёнаў №№ 59а і 59б. Тут жа пасля дзвюх карэкціровак праектнай дакументацыі змяніліся канфігурацыя і шчыльнасць мікрараёна. Дарэчы, буйны шматфункцыянальны гандлёвы цэнтр і аўтамабільныя паркінгі тут таксама запланаваны. Патэнцыйныя інвестары ўжо ёсць. Што датычыцца невялікіх гандлёвых аб'ектаў, то яны ўжо тут працуюць, напрыклад, у прыстасаваных памяшканнях размешчаны прадуктовыя крамкі. А вось наяўнасць дзіцячых садкоў ва ўбудаваных памяшканнях жылых дамоў толькі абмяркоўваецца. Участкі пад асобна пабудаваныя садкі і школу на Шведскай Горцы зарэзерваваны, аднак пра іх узвядзенне размова пакуль не ідзе.

Замест прыватнага сектара на вуліцы Барыкіна, якая звязвае цэнтр з Савецкім раёнам, ужо актыўна вядзецца будаўніцтва. Пайшлі пад знос прыватныя дамы на цотным баку — там ужо з'явіўся шэраг будынкаў першай лініі. Забудоўшчыкі падлічылі, што змогуць уціснуць у гэтую прастору 35 секцый буйнапанэльных дамоў.

Будуць зносіцца ў далейшым і прыватныя дамы на вуліцы Палескай, яна стане шасціпалоснай, а па краях вырастуць шматпавярховікі. План дэталёвай планіроўкі Палескага мікрараёна распрацаваны. Архітэктары прапануюць уладкаваць на выездзе з «Сяльмаша» двухузроўневую развязку — застаецца знайсці на гэта фінансаванне. А вось пашырэнне і забудова вуліцы Хмяльніцкага пакуль што адкладаюцца.

Налета павінны пачацца будаўніча-мантажныя работы на месцы, дзе некалі быў Быхаўскі рынак, — там будзе супермаркет буйной гандлёвай сеткі. Зусім побач — на скрыжаванні вуліцы Карбышава з праспектам Кастрычніка налета, хутчэй за ўсё, пачнуць будаваць яшчэ адзін супермаркет. У Любенскім мікрараёне з'явіцца буйны шматфункцыянальны цэнтр з вялікім забаўляльным сектарам.

> Мікрараён Хутар у Навабеліцкім раёне будуецца пераважна для сем'яў, якія патрабуюць паляпшэння жыллёвых умоў. Ім аказваюць дзяржаўную падтрымку, таму будаўніцтва вядзецца хутка. Засталося ўзвесці 16 шматпавярховікаў, і раён будзе цалкам пабудаваны.

Пункт пракату неўзабаве адкрыецца на Ропаўскім пляжы. Там улетку будуць выдаваць катамараны, а ўзімку — лыжы і снегаходы. Такім чынам, у Гомелі можа з'явіцца першая пляжная зона адпачынку, якая прымае наведвальнікаў цэлы год.

Дэпутаты Гомельскага гарсавета падчас выязной сесіі пабывалі і ў самым маладым мікрараёне на поўначы Гомеля — на вуліцы Фядзюнінскага. Гарадскі УКС тут, у Чыгуначным раёне, будуе дзесяць дамоў. Аўтастаянкі вынесены за перыметр жылой забудовы, а ўсярэдзіне толькі гасцявыя паркоўкі і пешаходныя зоны. На дзіцячых пляцоўках кладзецца траўмабяспечнае гумовае пакрыццё. Паблізу няма прадпрыемстваў, ажыўленых аўтадарог, затое ёсць возера.

Сфарміраваны ўчастак пад забудову другой чаргі плошчай 75 гектараў. Выдзелена зямля пад узвядзенне шматфункцыянальнага гандлёвага цэнтра з комплексам бытавога абслугоўвання. У раёне будуць свае аддзяленні банка і паштовай сувязі. Уласныя школа і садок таксама запраектаваны. Ёсць адна асаблівасць: у складзе мікрараёна сфарміраваны восем участкаў пад індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва. Частка з іх ужо паспяхова прададзена на аўкцыёне.

Між тым налета плануецца ўвесці ў эксплуатацыю даслае аддзяленне паліклінічнага комплексу ў 17-м мікрараёне Цэнтральнага раёна горада над Сожам. Пра гэта паведаміў **старшыня Гомельскага гарвыканкама Пётр КІРЫЧЭНКА.** Сёлета ў Дзень горада **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ** уручыў мэру сертыфікат на буйную суму для завяршэння будаўніцтва паліклінікі ў мікрараёне № 17. Акрамя выдзеленых ужо сродкаў будуць і дадатковыя, бо аб'ект уключаны ў тым ліку ў рэспубліканскую інвестыцыйную праграму. Яшчэ сёлета плануюць завяршыць будаўніча-мантажныя работы, а потым будуць закупляць і манціраваць абсталяванне.

І ўжо зусім хутка павінен адкрыцца новы аб'язны мост цераз Сож недалёка ад горада. Цяпер транзітныя машыны ідуць непасрэдна праз Гомель, што вельмі нязручна для яго жыхароў. Праз гэты мост праходзіць участак рэспубліканскай трасы М8 ад граніцы Расіі да Украіны. Яго даўжыня — 500 метраў. Старую пераправу на гэтым участку закрылі па аварыйных прычынах у жніўні мінулага года, хуткім часам яе дэмантуюць. Адкрыць рух на аб'екце плануецца ў пачатку лістапада.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ДОБРЫ ПРЫКЛАД

ПРЫГАЖОСЦЬ СВАІМІ РУКАМІ

У Новалукомлі малады ксёндз самастойна добраўпарадкоўвае тэрыторыю касцёла

МІКАЛАЙ Ліпскі служыць у касцёле Святой Марыі Магдалены ў Новалукомлі Чашніцкага раёна, што на Віцебшчыне, сваімі сіламі добраўпарадкоўвае прылеглую да храма тэрыторыю і спадзяецца на Божую дапамогу, паведамляюць «Віцебскія весткі».

Адзінае, што перашкаджае да канца навесці парадак на тэрыторыі касцёла Святой Марыі Магдалены, — цяжкія бетонныя пліты, спадчына былой кацельні. Мікалай Ліпскі спадзяецца, што ўдасца вырашыць і гэтае пытанне, а як толькі зямля вызваліцца, на месцы ранейшага будаўнічага смецця з'явяцца кветкавыя клумбы.

vitvesti.by

Будынак дастаўся касцёлу ад ранейшай гарадской кацельні. У пачатку 2000-х яго выкупілі пад каталіцкі храм і з тых часоў імкнуцца давесці да ладу: прылеглая тэрыторыя была моцна захламленая. А цяпер на яе прыемна паглядзець: адразу за варотамі кветнік, выкладзеныя сцяжынкі вакол будынка, за ім міні-сажалка са статуяй Святой Марыі Магдалены і невялікім вадаспадам, сёлета паставілі плот.

Малады святар у Новалукомскім прыходзе ўсяго два гады, усе работы імкнецца рабіць сваімі рукамі. Па магчымасці яму дапамагае бацька. Ксёндз Мікалай Ліпскі жартуе: даводзіцца не толькі несці слова Божае людзям, але і паралельна асвойваць будаўнічыя спецыяльнасці. Зрэшты, справа паволі рухаецца. Ды і прыхаджане не застаюцца ўбаку, бо ім і самім прыемна прыходзіць у прыгожы храм.

Да юбілею Новалукомля і напярэдадні дня памінання святога Максіміліяна Кольбэ на тэрыторыі касцёла паставілі статую гэтаму святару. Ён з'яўляецца заступнікам энергетыкаў, што актуальна для горада, дзе большасць жыхароў працуе на Лукомльскай ДРЭС.

Мікалай Ліпскі праводзіць службы яшчэ і ў касцёле ў Чашніках. Дарэчы, у райцэнтры святар таксама добраўпарадкоўвае тэрыторыю касцёла сваімі рукамі. Але там яму на дапамогу прыходзяць арганізацыі: і машыну можна выпісаць, і рабочых папрасіць дапамагчы. У Мікалая Ліпскага ёсць план дадаць прыгажосці і ва ўнутранае ўбранне Новалукомскага і Чашніцкага касцёлаў. Словам, агульнымі намаганнямі і па ініцыятыве актыўнага ксяндза многае мяняецца да лепшага як звонку касцёлаў, так і пад іх склепеннямі.

З ПОШТЫ «МС»

НІ ПРАЙСЦІ, НІ ПРАЕХАЦЬ...

«КАЛІ заасфальтуюць аўтадарогу Н8345 Туркаўшчына — садовае таварыства «Івушка»? — з такім пытаннем звярнуліся ў «Мясцовае самакіраванне» жыхары гэтай вёскі. — Працягласць трасы ўсяго 1,4 кіламетра. Мы дабіваемся ўжо дваццаць гадоў, каб паклалі цвёрдае пакрыццё. Але, як кажуць, воз і сёння там».

Як сцвярджаюць грамадзяне, уладкаванне гэтай дарогі для іх жыццёва неабходнае. Яна ўся ў калдобінах, нагадвае сабой мыйную дошку. Пройдзе грэйдар, выраўнуе палатно, але пасля першага дажджу ўсё вяртаецца на колы свае, бо сама дарога ніжэйшая, чым абочыны. У населеным пункце жыве школьнік. Пакуль праблем дабрацца ў школу няма — ходзіць маршрутка. А вось калі выпадзе снег і пачнецца галалёдзіца, рэйс закрыюць, бо падняцца на гару аўтобусу будзе праблематычна. Тады дзіця трэба будзе весці за два кіламетры да асноўнай асфальтаванай дарогі, па якой курсіруе маршрутнае таксі.

У вёсцы жывуць практычна адны пенсіянеры, інваліды, даводзіцца і «хуткую» выклікаць. Кожны дзень у вёску машынай дастаўляюць пошту, два разы на тыдзень прыязджае аўтакрама. А зімой пачнуцца праблемы — то дарогу замяце, то пад гару транспарт не ўзбярэцца.

«Мы неаднаразова звярталіся ў розныя інстанцыі, на тэлефонныя лініі, але ўсё безвынікова. Адказ заўжды адзін і той жа: дарога ў добрым стане», — кажуць заяўнікі.

Дарога Н8345 вядзе да мноства садовых таварыстваў. Ад таварыства «Івушка» ідзе далей, да садовага таварыства «Крышталь» — усяго яе працягласць складае 1,7 кіламетра. У 2006 годзе ў вёсцы быў пакладзены асфальт на ўчастку ў 300 метраў. У 2012-м на астатняй частцы дарогі праведзены бягучы рамонт з падсыпкай пясчана-гравійнай сумессю, устаноўкай неабходных дарожных знакаў і пераводам грунтавога пакрыцця ў гравійнае. «Рэгулярна праводзіцца прафіляванне палатна аўтагрэйдарам. Зімой яно апрацоўваецца супрацьгалалёднымі матэрыяламі ў адпаведнасці з дзеючымі нарматывамі», — адзначаюць у ДРБУ-167, якое абслугоўвае аўтадарогу.

> Мы неаднаразова звярталіся ў розныя інстанцыі, на тэлефонныя лініі, але ўсё безвынікова. Адказ заўжды адзін і той жа: дарога ў добрым стане.

Вядома, сельскія жыхары хочуць жыць камфортна, са зручнасцямі, як у горадзе. І мясцовыя ўлады гэта добра разумеюць. Але не заўсёды эканамічныя і фінансавыя магчымасці супадаюць з жаданнем. Як адзначыў на адным з прыёмаў грамадзян старшыня Мінаблвыканкама Анатоль Ісачанка, у Мінскай вобласці неабходна асфальтаваць 16 тысяч кіламетраў дарог. І зрабіць гэта адначасова проста немагчыма. У Валожынскім раёне такіх магістраляў больш за тысячу кіламетраў, у тым ліку больш за 500 кіламетраў — гравійныя і грунтавыя. І класці асфальтабетон усюды эканамічна неапраўдана. Таму нарматывы дазваляюць на другасных дарогах гравійнае пакрыццё.

Як расказалі ў ДРБУ-167, мясцовыя жыхары ставяцца да сітуацыі з разуменнем, дачнікі закідваюць скаргамі. Але найперш абслугоўваюцца асноўныя аўтатрасы, затым другасныя, у апошнюю чаргу — праезды да садаводчых таварыстваў. Такія патрабаванні нарматыўных актаў.

Якое ж выйсце з сітуацыі? Дачнікі і іншыя зацікаўленыя асобы могуць заасфальтаваць дарогу ў складчыну, талакой, кажа старшыня Ракаўскага сельвыканкама Аляксандр Мякіна. Садаводчае таварыства — гэта амаль «дзяржава ў дзяржаве», якая жыве па сваіх правілах, статуце. Умешвацца ў яго дзейнасць сельскі Савет не мае права. Рашэнне аб уладкаванні дарогі могуць прыняць толькі члены таварыства на агульным сходзе. Але не ўсе дачнікі здольныя раскашэліцца на гэты бюджэт: сярод іх ёсць і пенсіянеры, і шматдзетныя, і маламаёмасныя. А пабудова дарогі — задавальненне дарагое. Па падліках спецыялістаў, на пракладку праблемнага ўчастка патрабуецца больш як 90 тысяч рублёў.

Дадам, што трасу Н8345 перадалі на баланс ДРБУ-167 у пачатку 2000-х. Натуральна, што арганізацыя займалася ў першую чаргу дарогамі, якія патрабавалі тэрміновага рамонту. Акрамя таго, штогод камісія пры райвыканкаме вызначае ўчасткі, за якія неабходна ўзяцца першачаргова. Пасля зацвярджэння мясцовымі ўладамі іх спіс друкуецца ў раённай газеце.

Хто ж вінаваты ў гэтай сітуацыі? На мой погляд, у кожнага з бакоў свая праўда. Мясцовая ўлада кіруецца эканамічнай мэтазгоднасцю і займаецца самымі праблемнымі ўчасткамі. Такая сітуацыя, дарэчы, характэрная не толькі для Валожынскага раёна, а для большасці рэгіёнаў краіны.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 28 ноября 2019 года проводит 19-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номер лота	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
226	ЧМЗАП-5208 прицеп-тяжеловоз 1990 г. рама № 4316 инв. № 01510286 *13 431 км*	г. Гомель, Областное УМЧС	4 500,00	900,00
227	Специальный автомобиль Урал-375АМ с кузовом-фургоном К2-375 в составе: кузов-фургон К2-375 № 071259 1986 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375АМ ш. 447839 дв. 646909 1986 г. *4 кат. 2 817 км*	г. Осиповичи, в/ч 01313	6 500,00	1 300,00
228	Автошасси ГАЗ-66-14 ш. 0522138 дв. 260265-87 1987 г. *4 кат. 6 129 км*	н. п. Станьково, в/ч 25819	3 000,00	600,00
229	Автошасси ГАЗ-66-14 ш. 0512321 дв. 154244 1987 г. *4 кат. 6 341 км*	н. п. Станьково, в/ч 25819	3 000,00	600,00
230	Автошасси ГАЗ-66-14 ш. 0524643 дв. 275303 1987 г. *4 кат. 9 028 км*	н. п. Станьково, в/ч 25819	3 000,00	600,00
231	Автошасси КамАЗ-431010 ш. 0006687 дв. 764023 1989 г. *4 кат. 5 930 км*	н. п. Новоколосово, в/ч 25819	8 000,00	1 600,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **28 ноября 2019 г. в 10.30.**
К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 25 ноября 2019 года**.
Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **28 ноября 2019 г. с 9.00 до 9.45.**
Победитель аукциона обязан:
1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.
Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY51BPSB30121078830299330000, российские рубли - р/с BY05BPSB30121078830876430000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-СберБанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18, корп. 1, код BPSBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России № 30101810400000000225, **Без НДС**. **Справки по тел/факс: (017) 398 05 41.**

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже недвижимого имущества РУП «Минскэнерго»

Лот № 1: склад с инв. № 615/D-16408, площадь – 68,3 кв. м, г. п. – 1969. Адрес: Минская обл., Червенский р-н, Рованичский с/с, аг. Рованичи, ул. Озерная, д. 10 – 2. Начальная цена с НДС –14 107,43 бел. руб. Задаток – 1 410,74 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %. Кап. строение с инв. № 615/С-32993, в котором расположен склад с инв. № 615/D-16408, находится на земельном участке с кадастровым номером 625882708601000345 площадью 0,2440 га. Право аренды (доля 1/2, по 01.09.2064). Переход прав на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Условия аукциона: 1. Заключить с Продавцом договор купли-продажи в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона; 2. Условия оплаты приобретенного Объекта оговариваются сторонами при заключении договора купли-продажи; 3. Оплатить стоимость услуги и стоимость затрат Организатора аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона

Размер штрафа в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 составляет 1 000,00 бел. руб.

Аукцион состоится 28.11.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: РУП «Минскэнерго» филиал «Борисовские электрические сети», 222518, г. Борисов, ул. Строителей, 12, тел. 8 (0177) 73-31-57. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9.
Задаток перечисляется нар/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 28.11.2019 (Лот № 1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, и с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 26.11.2019 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта: Ермолович Елена Васильевна, тел. 8 (044) 713-99-92

☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

Утерянный представительством Белгосстраха по Фрунзенскому району г. Минска бланк полиса «Обязательное медицинское страхование иностранных граждан и лиц без гражданства, временно пребывающих или временно проживающих в Республике Беларусь», форма 2РН, серии БВ, № 3380263 **считать недействительным.** УНП 100122726.

ПА СТАРОНКАХ АДНОЙ РАЁНКІ

Сапраўдны народны праект

Ужыхароў аграгарадка Рычоў, што на Гомельшчыне, — свята: за ваколіцай населенага пункта ўрачыста адкрылі мост цераз Сцвігу. А аднаўлялі пераправу талакой.

— Гэта была будоўля стагоддзя, — не хавае радасці перад журналістам жыткавіцкай раённай газеты «Новае Палессе» былы калгасны бухгалтар Аліна МАРКЕВІЧ. — Кожны ўклаўся асабіста, затое цяпер шлях адкрыты і ў бяспецы. Дзякуй нашаму старшыні сельскага Савета Уладзіміру Кучынскаму.

Вельмі задаволена пераменамі і Марыя Лазіцкая, галоўная рычоўская ягадніца. У сёлетнім, паводле яе слоў, не самім ураджайным сезоне пенсіянерка сабрала 800 кілаграмаў чарніц. Працавітая жанчына прызнаецца, што зарэчны лес для яе сінонім жыцця, таму на добрую справу не пашкадавала паўсотні кроўна зароблены рублёў, што ў два з паловай разы больш за сярэдні ўнёсак. Зрэшты, яе прыклад шчодрасці прадэманстравалі яшчэ некалькі чалавек. Дарожная артэрыя тут даўно патрабавала сур'ёзнага рамонту. Аднак з розных прычын ён усё адкладваўся, пакуль ініцыятыву ўлады не падхапіла насельніцтва. За Сцвігай у многіх сенажаці, народ нарыхтоўвае там і дровы. Каб не рызыкаваць на тонкіх лагах, часта даводзілася дабірацца ў аб'езд за 14 кіламетраў.

Вырашылі — зрабілі. Сельскія актывісты сабралі па хатах звыш 1500 рублёў для набыцця будматэрыялаў. Іх спатрэбілася амаль 200 кубоў. Далей падключыліся лясгас і перасанальна «Бярэжанскае», а таксама Рычоўскае лясніцтва. Спілаваныя бярвёны ператваралі ў дошкі на піларараме ў ААТ «Людзяневічы» і ТАА «Белкітфорэстры». А непасрэднымі выканаўцамі такога патрэбнага праекта сталі ваенныя, якія бліскуча пацвердзілі вядомы лозунг аб адзінстве народа і арміі.

— Стараліся працаваць якасна і хутка, — кажа намеснік камандзіра інжынерна-мостабудаўнічага батальёна 188-й гвардзейскай інжынернай брыгады, капітан Аляксандр САМУЙЛАЎ, і паведамляе, што ўвасьмёх зрабілі ўсё за тры тыдні. — Людзі нас усяляк падтрымлівалі. Упэўненыя, што збудаванне праслужыць доўга.

На ўрачыстым адкрыцці **старшыня раённага Савета дэпутатаў УЛАДЗІМІР КУЛЕШ** (дарэчы, менавіта ён вёў перагаворы з Міністэрствам абароны) шчыра падзякаваў усім, хто прычыніўся да ўзвядзення пераправы:

— Мост звязвае не толькі берагі, але, што важней, аб'ядноўвае сэрцы і душы. Гэта сапраўды народны праект, якім мы ўсе можам ганарыцца.

Самыя яркія моманты свята: хлеб-соль — будаўнікам, граматы — усім памочнікам і народная песня ў падарунак ад самадзейных артыстаў. А пасля таго, як іерэй Вячаслаў Наскевіч асвяціў 56-метровы мост і па ім праехаў першы мікрааўтобус, пераправу пратэсціравалі тыя, без каго не здарылася б гэтай падзеі. Работу мясцовыя жыхары ў адзін голас ацанілі на выдатна.

Дарэчы, гэта ўжо трэці мост, адрамантаваны талакой у раёне за апошнія некалькі гадоў.

ЧЫМ МОЖНА АЖЫВІЦЬ ВЁСКУ?

Добра мець хатку ў сельскай мясцовасі. А асабліва — у Перарове на беразе Прыпяці, што на Гомельшчыне. Усё харство шыкоўнай прыроды тут ацанілі жыхары розных рэгіёнаў Беларусі

АМАЛЬ цэлая вуліца, якая прымыкае да берага ракі, вылучаецца далёка не сельскімі хацінкамі. І ці ёсць лепшы адпачынак у аддаленым ад мегаполіса месцы? Ды што там выхадныя — у пераважна дагледжаных гаспадарамі будынках можна жыць цэлы год, упэўнены журналісты жыткавіцкай раённай газеты «Новае Палессе». І вось чаму.

Дзякуючы мінчанам і людзям з розных іншых гарадоў Беларусі, як суседніх, так і аддаленых, ёсць аптымістычная надзея — вёска будзе жыць!

Дарэчы, як заўважыла **старшыня Пераройскага сельскага Савета Іна ДАРАФЕЙ,** нерухомасцю на беразе абзаводзяцца і сёння. Яшчэ адна пікантнасць вясковага ўкладу, акрамя непаўторнасці прыроды, — жыццё ў знаёмай паміж сабой супольнасці і без цырымоній. І наогул — навошта купляць нерухомасць за мяжой, калі ў нас усё вакол шыкоўнае, а галоўнае — зразумелае і роднае. Ды і карысць падвойная, бо акрамя свайго задавальнення і хобі новыя людзі ўкладваюць сродкі. Напрыклад, ва ўмацаванне берага. Праблема вядомая — Прыпяць не так ужо і павольна заваёўвае сушу. Сама Іна Сцяпанаўна заўважае, што плошча яе бацькоўскага надзелу за некалькі гадоў паменшылася амаль удвая. А забяспечаныя ўласнікі жылля ўмацоўваюць бераг спецыяльным спосабам, а таксама і траву каля падворка выкасілі. Нядаўна і на просьбу актыўнага старшыні нечакана адгукнуліся.

— У нас брыль на сельскім Савеце знасіўся, трэба было б памяняць, — усміхаецца Іна Сцяпанаўна, — думаю, паспытаю шчасця, можа, дапаможа наш дачнік? Мужчына адразу адгукнуўся і літаральна на наступны дзень прывёз некалькі лістоў металапрофілю.

Матэрыял з'явіўся, а з рук у сельсавеце — толькі жаночыя. І зноў дапамаглі сталічныя жыхары. Усім карысць.

Наогул у сваёй вотчыне Іна Сцяпанаўна, якая шмат гадоў была дырэктарам школы, ведае ўсіх ад малога да старога. Зрэшты, па гэтай жа прычыне з боку жыхароў і давер, і актыўнасць старастаў. Менавіта ў Перарове раней, чым у суседзяў, сабралі сродкі на вызваленне могілак ад небяспечных дрэў. Пры гэтым ініцыятары некалькі разоў абыходзілі хаты: спачатку заручаліся згодай землякоў, а потым збіралі грошы. Падвялі вынік складчыны — дзве тысячы рублёў, запрасілі альпініставў. Выйшла цалкам бюджэтна.

Дарэчы, падчас работ на могілках альпіністы (як ні стараліся асцярожна і акуратна працаваць) некалькі пахаванняў закранулі. Але, да іх гонару, падрабілі, падмалявалі. Папрасіўшы прабачэння, прапанавалі сваякам пахаваных тут у выпадку незадаволенасці кампенсаваць грашыма. Такое стаўленне падкупіла даверам.

Сёння ў Хлупіне неабыякавыя людзі разбіваюць скверык. Калі жыхары вёскі ладзілі агульныя ўрачыстасці каля дарогі, безгаспадарны ўчастак зарастаў травой і выглядаў неахайна. Чаму б не акультурыць, падумала Іна Дарафей, узяўшыся ўвасабляць у жыццё ідэю. І ва ўнісон дэпутату Палаты прадстаўнікоў Ірыне Кралевіч, якая пабывала нядаўна ў Перарове, стала пераконваць людзей і тлумачыць ім неабходнасць і важнасць таго ці іншага працэсу. У нашым выпадку правільна выбудаваны дыялог знайшоў водгук у Пераройскім лясніцтве. Яго супрацоўнікі і лаўку зрабілі на вуліцы, дзе цяпер перадыхнуць можа любы, асабліва пажылы падарожнік.

Извещение о проведении 26 ноября 2019 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк»

СВЕДЕНИЯ О ПРОДАВАЕМОМ ИМУЩЕСТВЕ:

Лот	Информация о предмете торгов	Начальная цена, руб.	Размер задатка, руб.
№ 1	Автомобиль VOLKSWAGEN CADDY MAXI RYCAR – 294544-03, регистрационный знак АІ 4212-7, кузов № X8929454Z90AK5342, WV1ZZZ2KZ9X038329, 2008 года выпуска, инвентарный номер 21111173, тип транспортного средства – грузовой фургон	9 472 в том числе НДС 20 %	451,05 в том числе НДС 20 %

Продавец имущества: Открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр. Жукова, 3.
Организатор аукциона: Консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф. 1703.
Торги проводятся в форме *открытого аукциона* в соответствии со ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и условиями проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк».
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.
Задаток перечисляется на расчетный счет Консалтингового унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» № BY23BAPB30122013100380000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНП 190982374, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.
Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС.
В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном условиями проведения торгов.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение **15 банковских дней** со дня проведения аукциона.

Торги проводятся 26 ноября 2019 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, д. 22, оф. 1703

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 25.10.2019 по 22.11.2019 включительно в рабочие дни с 08.30 до 12.30 и с 13.15 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф. 1703.
Получить дополнительную информацию и ознакомиться с документацией по условиям и предметам торгов можно на сайте www.zalogbanka.by, mail: torgi@agroconsult.by
Телефоны для справок: организатор аукциона: Tel./Fax 8 (017) 399 66 39, GSM MTS 8 (029) 816-64-46, GSM VEL 8 (044) 540-64-46.

Уважаемые акционеры открытого акционерного общества «Дорожно-строительного треста № 1, г. Витебск»

6 ноября 2019 года в 16.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск».
Собрание пройдет по адресу: г. Витебск, ул. Суворова, 16, актовый зал.

Повестка дня собрания:
1. О внесении изменений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться у председателя наблюдательного совета по адресу: г. Витебск, ул. Суворова, 16, с 28 октября 2019 года по 5 ноября 2019 года (время работы с 8.30 до 17.30) либо 6 ноября 2019 года по месту проведения собрания, контактный телефон (8-0212) 67-45-66.
Дата формирования реестра владельцев акций и список лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров 23 октября 2019 года.
Регистрация участников собрания с 15.35 до 15.55 по месту проведения собрания.
Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет
УНП 300000398

Мясцовае самакіраванне

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 24 кастрычніка 2019 года.